Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

НОВЫ НУМАРАГ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял друкуецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

ЎСТАНОВА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 5 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. месцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапаралі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапаралі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок шапаралі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьмешныя на 50 проц. даражэй. Свае тэрміны бярэцца 10 проц. наддатку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 • За кожны дадатковы — 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА кантораю газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 184 (2673) Серада, 14-га жніўня 1929 г.

СЬЦЯНА ПРАБІТА.

...тайская сьцяна, якой польскі фа... старацца адмежаваць сваіх ра... ...х ад братняй сувязі з працоўны... ...СР—прабіта. Дэлегацыя, абраная ...ўнымі Польшчы, Заходняй Бела... і Заходняй Украіны на масавых ...х, прабралася праз усе загароды ...льную краіну—бацькаўшчыну пра... ...х усяго сьвету СССР.

...я пасылкі дэлегацыі ўзьнікла ў ...ы рабочай клясы і працоўнага ...ства Польшчы, Заходняй Белару... Заходняй Украіны ў той час, ка... ...шысцкі ўрад ня даў дазволу дэ... ...ыі працоўных палякаў СССР па ...у Польшчу, на так званы выезд ...ежных палякаў. Тады рабочыя ...ді свой рашучы пратэст супроць ...ецкіх махінацый падрыхтоўкі на... на СССР і дзеля доказу сваёй ...арнасьці з пралетарыятам і пра... ...ым сялянствам СССР распачалі ...нію выбараў дэлегатаў дзеля па... ...ў СССР.

...гледзячы на суровы тэрор, які ...ваў фашысцкі ўрад да тых, каго ...ралі дэлегатам, ня гледзячы на ...што сходы лічыліся антыдзяржаў... ...рабочыя пад кіраўніцтвам сваёй ...ністычнай партыі наладзілі не... ...кі сот масавых адчыненых сходаў ...ралі сто дэлегатаў. Аднак ня ўсе ...таты змаглі прыехаць у СССР. ...ку дэлегатаў фашысцкі ўрад пася... ...у астрогі. Прыехала толькі 26 ча... ...к, большасьць з іх беспартыйныя ...чыя з шматгадовым стажам вы... ...чай і грамадзкай працы.

...рыезд дэлегацыі, пасланай працоў... Польшчы ў СССР мае вельмі важ... значэньне. Фашысцкая Польшча,— ...пост сусьветнага імпэрыялізму— ...на узбройваецца. Уся польская гас... падарка прыстасоўваецца да вайны. Рост ваеннай прамысловасьці, мілітарызацыі чыгункі ўсяго грамадзкага жыцьця сьведчыць аб тым, што фашысцкі ўрад рыхтуецца да нападу на СССР.

Пры такіх варунках прыезд дэлегацыі ад імя мільёнаў працоўных і прыгнечаных Польшчы і іх заява аб тым, што ў выпадку нападу польскага фашызму на СССР польскія рабочыя і працоўнае сялянства, як адзін чалавек, паўстануць на абарону СССР, набывае вельмі вялікае значэньне. Калі нам дадуць вінтоўкі—так заявілі рабочыя на сходах,—дык мы накіруем іх на свайго клясавага ворага— на фашысцкую дыктатуру.

Перадайце працоўным СССР, што бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету — СССР — будзем абараняць да апошняй кроплі крыві,—такі наказ давалі міліёны выбаршчыкаў працоўных Польшчы Заходняй Беларусі і Зах. Украіны.

Словы рабочых не разыходзяцца са справаю. Аб гэтым сьведчаць апошнія падзеі гэраічнай барацьбы польскага пралетарыяту, барыкады ў Пабіянцах, бойкі на вуліцах Варшавы, Лодзі, Вільні і іншых гарадоў, сялянская самаабарона ад зборшчыкаў падаткаў у Заходняй Беларусі, бойкі сельска-гаспадарчага пралетарыяту з паліцыяй на Заходняй Украіне. Кожнае выступленьне супроць „сваіх" „родных" эксплёататараў, кожная заява рабочых аб іх гатоўнасьці выступіць на абарону СССР, аб сьвядомасьці сваёй клясавай мэты зьяўляюцца парукаю ў тым, што штык будзе накіроўн у сапраўднага клясавага ворага—у фашызм.

Масавыя задачы пасеўнай кампаніі.

...адрыхтоўка да васеньняй пасеўнай ...паніі праходзіць у бягучым годзе ...мовах рэвалюцыйных абставін вы... ...ных па размаху і глыбіні і ад... ...е, што ў выніку яскрава права... ...ага курсу індустрыялізацыі краіны ...упае тое паскараньне тэмпу руху, ...е было гэніяльна прадугадана Ле... ...м. Так нядаўна складеныя наметы ...пяцігадовага пляну разьвіцьця ...скай гаспадаркі ў шэрагу вы... ...каў зьяўляюцца недастатковымі ...сучаснага руху. Але на ўсім руху ...ыць выразная пячатка клясавай ...ацьбы. Усякае колькі-небудзь сур'... ...е мерапрыёмства, паказанае сацыя... ...ічнай рэканструкцыяй сельскай ...падаркі, сустракае адважнае супра... ...ьненьне кулацкіх элемэнтаў. Змага... ...ся з кулаком бядняцкія і серад... ...ія масы становяцца на шлях рэ... ...цыйнай перабудовы сваёй дробнай ...далай гаспадаркі, але кожны крок ...гэтым шляху нямінуча выклікае ...ейшую барацьбу, абвастрэньне ба... ...ьбы.

...падрыхтоўцы азімай кампаніі не... ...одна самым дакладным чынам улі... ...ць поўнасьцю ўсе гаспадарчыя кля... ...ыя ўмовы, характарызуючыя сучас... ...ы этап разьвіцьця савецкай вёскі. ...апрыёмствы падрыхтоўкі да васень... ...а севу, пры правільным іх права... ...льні, павінны даць у выніку ўма... ...ньне саюзу рабочай клясы з се... ...ляком, умацаваньне бядняцка-серад... ...цкага блёку супроць кулака. Абапі... ...чыся на зацікаўленасьць серадняка ...правадзімых мерапрыёмствах, абапі... ...чыся на стымулюючы ўплыў на... ...й палітыкі цэн і ільгот па падатку ...мавінны дамагчыся ў ходзе кам... ...ні ўзмацненьня тэмпу ўцягваньня ...адняцкіх мас у сацыялістычнае бу... ...ніцтва.

У той-жа час неабходна сачыць за тым, каб мерапрыёмствы, накіраваныя супроць кулака, не забівалі серадняцкую масу вёскі, каб у палітыцы ў адносінах да серадняка не паўтараліся выпадкі перагібаў, якія наглядаліся ў мінулых кампаніях. Пры правядзеньні ўсіх зазначаных мерапрыёмстваў, асабліва па аказаньні дапамогі беднаце, неабходна самым бязьлітасным чынам змагацца кулацкім супраціўленьнем ліквідаваць у самы кароткі тэрмін выпадкі бюракратызму.

Падрыхтоўка да васеньняга севу толькі ў тым выпадку пойдзе пасьпешна, калі мы ў час ударым па недахопах, дапаможам нізавым арганізацыям у ходзе працы выпраўляць недахопы, выпраўляць клясавую лінію. Тут асабліва важна выразнае партыйнае кіраўніцтва. Мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны бязупынна сачыць за разгортваньнем кампаніі, заснаваць шчыльную сувязь з савецкімі органамі каапэрацыі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі вёскі.

У азімай пасеўнай кампаніі, якая зьяўляецца важнейшым вытворчым момантам жыцьця вёскі неабходна мабілізацыя грамадзкіх сіл навакол партыйнага кіраўніцтва. Прафсаюзы і арганізацыі вясковай беднаты павінны быць асноўнай апорай партыйных арганізацый пры правядзеньні мерапрыёмстваў клясавага значэньня. Трэба цьвёрда запамятаць, усьвядоміць што выканаўня пляну і нават перавышэньня пляну--далейшага пашырэньня пасеўных плошчаў, уздыму ўраджайнасьці мы даможамся толькі ў тым выпадку, калі зможам правільна злучаць на практыцы вытворчыя задачы з клясавай палітыкай.

„Правда".

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС.

У зьвязку з няспыняючымися чуткамі, якія распаўсюджваюцца ...фіцыйных кітайскіх крыніц аб перамовах, якія нібы адбываюцца ...між былым давераным у справах Кітаю ў СССР Чжу-Шао-Яна і ...адстаўніком СССР, ТАСС упаўнаважан паведаміць наступнае: ...а жніўня Чжу-Шао-Ян прыбыўшы на станцыю Манчжурыя зьвяр... ...ся па тэлеграфу да т. Карахана з просьбаю камандыраваць на ...ку паўнамоцнага савецкага прадстаўніка для абмеркаваньня ўсіх ...таньняў зьвязаных з канфліктам на ЎК чыгунцы, на вырашэньне ...х ён нібы ўпаўнаважан Нанкіным. 8-га жніўня т. Караханам быў ...даны адказ, у якім т. Карахан з прычыны існуючых ужо усных ...амоў паміж Мельнікавым і Цаем, якія паказалі, што кітайская ...да лёгка адмаўляецца ад сваіх уласных прапаноў, зазначыў, ...о ў выпадку, калі Чжу-Шао-Ян мае перадаць адказ на вядомы ...ліст Чжан-Сюэ-Ляну і папярэднія ноты савецкага ўраду, ён ...магчымасьць пераслаць яго ў пісьмовай форме па тэлеграфу, ...праз 86-ты разьезд. 9-га жніўня была атрымана новая тэле... ...ма Чжу-Шао-Ян, у якой гаварылася, што яму цяжка зрабіць ...ю-небудзь пісьмовую прапанову па недастатковай яго асьвя... ...мленасьці аб гутарках, меўшых месца ў перамовах паміж т. Мель... ...авым і Цаем і што ён лічыць неабходным вырашэньне ўсіх ...ічных пытаньняў шляхам пасылкі спэцыяльнага ўпаўнаважанага ...ўвесь час перамоў з ім, або дазволу яму (Чжу-Шао-Яна) ўезда ...Маскву для асабістага спатканьня з т. Караханам.

З тае прычыны, што гэты адказ пана Чжу-Шао-Яна ня ўно... ...ь нічога новага, Народны Камісарыят Замежных Спраў пастаніў устрымацца ад адказу на яго абмежаваўшыся адказам, які ...быў ужо дадзен 8-га жніўня.

...ЭЛЕГАЦЫЯ ПРАЦОЎНЫХ ПОЛЬШЧЫ У ПАДАРОЖЖЫ ПА СССР.

...МАСКВА, 12-8. Дзьве групы рабо... ...ілянскай дэлегацыі Польшчы, За... ...ній Украіны і Заходняй Беларусі ...халі з Масквы для азнаямленьня з ...цьцём Саюзу. Першая група, у ...д якой уваходзіць старшыня т. Отто ...Ланцуцкі і іншыя, накіраваліся ...маршруту Масква—Арцёмаўск— ...оў—Уладыкайказ—Тыфліс—Баку. Другая група наведае Харкаў—Шахтную—Ўласаўскую—Гарлоўку—Днепрапятроўск—Аляксандраўск—Севастопаль. Трэцяя група на чале з Пэрам, якая выязджае з Масквы сёньня, наведае Арэхава-Зуева, Івана-Вазьнясенск, Кінешму, Клецк, Башкіну, Ніжні Ноўгарад і Сталінград.

Праграма Чан-Кай-Шы „выконваецца".

ДЗІКІЯ КАТАВАНЬНІ І ЗЬДЗЕКІ НАД САВЕЦКІМІ ГРАМАДЗЯНАМІ. БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІЯ БАНДЫ ЎЧЫНЯЮЦЬ ПАГРОМЫ. ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ ЎЧЫНКІ НАНКІНСКАГА ЎРАДУ.

Азьвярэлыя каты распраўляюцца.

ТОКІЁ, 12-8. Водлуг вестак агенцтва «Дэмпо Цусін» каля 200 савецкіх грамадзян, прыбыўшых 11 жніўня на станцыю Манчжурыю былі зрабаваны кітайскай паліцыяй. З прычыны адсутнасьці паязду яны ня могуць выехаць у СССР.

„Токіё Асахі" паведамляе з станцыі Пагранічнай, што 60 савецкіх служачых У.-К. чыгункі, якія адмовіліся ад працы, арыштаваны паліцыяй. Водлуг паведамленьня агенцтва Сін-Буэн-Рэнго ўноч на 9 жніўня ў Харбіне арыштаваны 110 савецкіх грамадзян, сярод якіх 60 камсамольцаў.

Белагвардзейскія банды арганізуюцца.

ШАНХАЙ, 12-8. Як перадае агенцтва Го-Мінь, мукдэнцы выклікалі ў Хайлар 3 дадатковых батальёны хэйлунцзянскага войска і некалькі самалётаў і бронепоездаў. Водлуг слоў агенцтва, „таемныя падрыхтаваньні расейскіх белагвардзейцаў для нападу на сваіх чырвоных ворагаў па той бок граніцы робяць задачу манчжурскай улады вельмі цяжкай, таму што ўсякі напад белых на савецкае войска нямінуча будзе мець адпаведныя вынікі для кітайскага войска».

Разьбіўся цягнік

ТОКІЁ, 10-8. Харбінскі карэспандэнт «Дэмпо Цусін» паведамляе, што 9 жніўня поезд № 51 вышоў з рэек блізка Харбіна. Разьбіта 28 вагонаў і паранена 7 кандуктараў. У Харбіне па ранейшаму атмасфэра тэрору.

Водлуг вестак „Ніці-Ніці" за апошнія два дні з чыгункі звольнена каля тысячы савецкіх служачых. На станцыі Манчжурыя сабралася шмат савецкіх грамадзян, якія знаходзяцца пад вартаю салдат і пазбаўлены магчымасьці вярнуцца на бацькаўшчыну.

Пакідаюць працу.

ТОКІЁ, 10-8. З Харбіну паведамляюць, што паліцыя абкружыла ўвечары рабочы квартал каля мэханічных майстэрняў і арыштавала звыш 100 савецкіх грамадзян. Па вуліцах ходзяць узмоцненыя патрулі. Пры паліцыі арганізаваны спэцыяльныя атрады на матацыклетах і аўтамабілях. 8-га і 9-га жніўня спынілі работу звыш 3-х тысяч служачых УК чыгункі савецкіх грамадзян. На многіх станцыях і прадпрыёмствах чыгункі савецкія служачыя спынілі работу ў поўным складзе і падалі ў адстаўку.

Адміністрацыя УК чыгункі аддала загад ня прымаць заяў аб адстаўцы, але гэта не памагло. 9-га жніўня блізка станцыі Стары Харбін вышоў з рэек таварны поезд. У Дайлары ідуць вялікія ваенныя падрыхтоўкі. У ваколіцах гораду шмат войска рыюць акопы і будуюць умацаваньні. Са складаў УК чыгункі забіраецца шмат матар'ялаў.

Беспрацоўе—праступак

ТОКІЁ, 10-8. У зьвязку з масавымі самазвальненьнямі савецкіх грамадзян зроблен загад аб узмоцненай ахове чыгункі, арганізаваны штаб аховы Харбіна, які абвясьціў, што ўсе няпэўныя элемэнты будуць арыштаваны і сурова пакараны. Няпэўным элемэнтам будуць лічыцца ўсе асобы, якія ня знойдуць сабе якіх-небудзь заняткаў.

Пад гэтую катэгорыю як відаць падводзяцца беспрацоўныя самавольна пакінуўшыя працу, якіх ёсьць некалькі тысяч. Харбінскія газэты, з мэтаю супакоіць насельніцтва, зноў распаўсюджваюць чуткі, што Серабракоў прыбыў на станцыю Таўліна для перамоў.

Скарга „мамашы".

ТОКІЁ, 10-8. Шанхайскі карэспандэнт газэты „Цзі-Цзі" паведамляе, што Чан-Кай-Шы і Ван-Чжэн-Цін прапанавалі Чжу-Шао-Яну затрымацца на ст. Манчжурыя яшчэ некаторы час, каб потым зьвярнуцца да Лігі Нацый з скаргай на „незамірымую" пазыцыю савецкага ўраду. Такім чынам нанкінскі ўрад спадзяецца заручыцца сымпатыямі дзяржаў.

Арышт 80.

ТОКІЁ, 12-8. З Харбіну паведамляюць: Апошнія дні на станцыі Манчжурыя арыштавана больш 80 савецкіх грамадзян за самазвальненьне з працы на УК чыгунцы. Манчжурская ўлада разглядае самазвальненьне, як спробу забастоўкі.

ДВ банк ліквідуе ўсе справы.

ТОКІЁ, 12-8. Водлуг паведамленьня з Харбіна старшыня праўленьня ДВ банку заявіў аб зачыненьні ўсіх аддзяленьняў банку ў Кітаі. Цэнтральная кантора Дальбанку ў Харбіне зачыніцца пасьля сходу акцыянэраў у бліжэйшыя дні.

Ваенная „магутнасьць".

ТОКІЁ, 12-8. Як паведамляюць з Харбіну, у мясцовым афіцыёзе Гун-Бао зьмешчана паведамленьне аб тым, што кітайскае камандаваньне, з мэтаю прадэманстраваць сваю ваенную «магутнасьць», адаслала на станцыю Манчжурыю 10 самалётаў.

АБЛАВА НА КВАТЭРЫ РАБОЧЫХ.

ТОКІЁ, 12-8. Агенцтва Сін-Бун-Рэнго паведамляе, што кітайская ўлада, пры садзейнічаньні расейскіх белагвардзейцаў, зрабіла некалькі аблаў на штаб-кватэры „падазроных", прычым «выкрылі камуністычныя змовы і такім чынам папярэдзілі ўсеагульную забастоўку на чыгунцы»

ДАГАВАРЫЦЦА НЯ МОГУЦЬ.

Супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі абвастраюцца.

Нямеччына супроць ангельскіх прапаноў.

ГААГА, 12-8. На сёньняшнім пасяджэньні фінансавай камісіі працягваліся дэбаты аб пастаўках натураю. Нямецкі дэлегат зазначыў, што пытаньне аб пастаўках натураю закранае справядлівыя інтарэсы Нямеччыны.

Адказваючы на скаргі ангельскага дэлегата, які на папярэднім пасяджэньні камісіі зазначаў на цяжкае становішча ангельскага экспарту, нямецкі дэлегат у сваю чаргу спасылаўся на надзвычайна цяжкае эканамічнае становішча Нямеччыны. Па яго словах доля Нямеччыны ў сусьветным экспарце, складаўшая ў 1913 годзе 12,7 пр. зьнізілася ў 1928 годзе да 9,13 проц. Разьмеры нямецкага экспарту ў 1928 годзе былі на 20 проц. ніжэй даваенных. Таксама скараціўся ў прыватнасьці экспарт вугалю з Нямеччыны, прычым Нямеччына ня мае магчымасьці, так як Англія, пакрываць зьніжэньне плацежнага балянсу. Далей ён зазначаў, што ў пачатку гэтага году ў Нямеччыне налічвалася амаль 3 мільёны беспрацоўных.

Даўшы далей гістарычны вобраз разьвіцьця паставак натураю, нямецкі дэлегат падкрэсьліў, што ў Вэрсальскім мірным дагаворы пастаўкі натураю былі прадугледжаны выключна ў інтарэсах транкрэдыторау. Нямеччына выказвае гатоўнасьць, у межах магчымасьці, пайсьці насустрэч пажаданьням Англіі. Па-першае, Нямеччына гатова пераглядзець правілы, якімі ў сучасны момант рэгулюецца тэхнічнае выкананьне паставак натураю і вызначацца іх кантынгент.

Па-другое, Нямеччына згаджаецца з ангельскім пунктам погляду па пытаньні аб вывазе назад паставак натураю з краін, якія іх атрымліваюць.

Па-трэцяе, Нямеччына выказвае гатоўнасьць абмеркаваць у камісіі нанова ўсе артыкулы пляну Дауэса, якія прадугледжваюць магчымасьць пашырэньня паставак натураю і павялічэньня тэрміну паставак натураю ў тых выпадках, калі набывае моц так званы пункт—трансфэр (г. зн. у тых выпадках, калі для ўхіленьня ад фінансавага крызісу ў Нямеччыне прыпыняюцца плацяжы ў валюце).

Па-чацьвертае, у пытаньні аб экспарце вугалю Нямеччына гатова распачаць перамовы аб устанаўленьні мінімальных цэн, што прадугледжана ўжо ў Вэрсальскім дагаворы.

Італьянскі дэлегат таксама выступіў супроць ангельскіх патрабаваньняў асабліва ў пытаньні аб нямецкіх паставках вугалю. Ён заявіў, што ўвоз ангельскага вугалю ў Італію скараціўся ня толькі з прычыны таго, што Італія пачала атрымліваць рэпарацыйны вугаль з Нямеччыны, але таксама з поваду канкурэнцыі іншых краін, напрыклад Польшчы. З другога боку ён падкрэсьліваў, што вываз вугалю палягчае Нямеччыне выкананьне яе абавязацельстваў.

Сьледам за тым было абвешчана аб наступным шырокім дакладзе Лушэра (Францыя) па пытаньні аб паставках натураю. На гэтым пасяджэньне скончылася. Наступнае пасяджэньне камісіі назначана на сераду. За гэты час будуць зроблены спробы дабіцца згоды шляхам прыватных перамоў.

НЯМЕЧЧЫНА НЯ ХОЧА ЎСТУПІЦЬ.

ГААГА, 12-8. На пасяджэньні палітычнае камісіі зноў выявіліся нямецкія супярэчнасьці. Штрэзэман заявіў, што Нямеччына ня можа прыняць пляну Юнга без папярэдніх гарантый эвакуацыі Рэйнскае вобласьці.

У адказ на гэта Брыян пачаў зазначаць на розныя тэхнічныя і вайсковыя цяжкасьці, якія вельмі моцна перашкаджаюць ажыцьцявіць эвакуацыю ўзімку і патрабуе доўгай падрыхтоўкі да эвакуацыі.

Штрэзэман адказаў, што ў такім выпадку ён будзе патрабаваць эвакуацыі Рэйнскае вобласьці яшчэ да пачатку зімы. Такім чынам, ніякіх канкрэтных вынікаў палітычная камісія пакуль не дасягнула. Прыватныя перамовы паміж Брыянам і Гендэрсэнам па пытаньні аб кантролі над Рэйнскаю вобласьцю таксама не далі пакуль ніякіх вынікаў.

Гендэрсон паранейшаму настайвае на тым, што кантрольная камісія павінна быць падначалена Лізе Нацый, а Брыян патрабуе яе поўнай незалежнасьці.

БАРАЦЬБА ЗА ЗОЛАТА.

ГААГА, 12-8. На рэпарацыйнай канфэрэнцыі адначасова з палітычнай барацьбой адбываецца таксама лютая барацьба на грашовым рынку, якая набыла вострыя формы, калі быў высунут плян заснаваньня банку міжнародных разрахункаў. Імпэрыялістычныя дзяржавы імкнуцца ўзмацніць свае пазіцыі пры будучых перамовах. Асноўны сродак барацьбы — павялічэньне сваіх залатых запасаў за кошт залатых запасаў ворагаў.

У гэтай барацьбе Англія церпіць няўдачу. Францыя і Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты робяць буйныя закупкі волата ў Англіі. Са студзеня па ліпень залаты запас урадавых банкаў Злучаных Штатаў павялічыўся на 347 мільёнаў даляраў, залаты запас французкага банку на 245 мільёнаў даляраў, залаты-ж запас ангельскага банку зьменшыўся за гэты пэрыяд на 60 млн. даляраў.

Гэтыя абставіны тлумачаць ангельскае пярэчаньне супроць вялікіх паўнамоцтваў банку міжнародных разрахункаў, а таксама ангельскім жаданьням дабіцца заснаваньня банку ў Лёндане.

Згода не дасягнута.

ГААГА, 12-8. У нядзелю ў Гаазе адбываліся прыватныя перамовы паміж кіраўнікамі дэлегацый галоўных зацікаўленых дзяржаў. Перамовы прасьледвалі дзьве мэты: па-першае, прымірыць Сноўдэна з французкаю дэлегацыяю, якая лічыла сябе абражанай рэзкімі выразамі Сноўдэна ў яго прамове на апошнім пасяджэньні фінансавай камісіі, па-другое знайсьці выхад з тупіка, створанага няпрымірымімі пазіцыямі Англіі і Францыі.

Першая мэта была дасягнута пасьля таго, як «Сноўдэн выказаў жаль адносна зьневажаючага тону сваіх заяў». Інцыдэнт абвешчан вычэрпваючым. Што-ж датычыцца другой мэты, дык перамовы прывялі толькі да згоды аб тым, каб згодна ангельскага патрабаваньня, фінансавая камісія абгаварвала ў першую чаргу пытаньне аб пастаўках натураю. Аднак, пры перамовах не намецілася ніякага збліжэньня паміж супярэчнымі пунктамі гледжаньня.

Макданальд гарантуе.

ГААГА, 12-8. Ангельская дэлегацыя на Гаагскай канфэрэнцыі паведамляе, што Сноўдэн атрымаў тэлеграму ад Макданальда, у якой ён вітае „цьвёрдую пазіцыю", абяцае Сноўдэну поўнае падтрыманьне і прапануе працягваць «рашучую абарону ангельскіх патрабаваньняў».

У колах канфэрэнцыі адзначаюць, што гэта тэлеграма расстрайвае французкія надзеі на разгалосьсі паміж Макданальдам і Сноўдэнам.

Едзе дэлегацыя ў СССР.

СТОКГОЛЬМ, 9-8. Орган дацкае кампартыі «Арбайтэр Блятэнд» агаласіў прапанову УсеЦСПС да рабочых, пасляць дэлегацыю ў СССР, у якую павінны ўвайсьці прадстаўнікі ад транспартных рабочых, мэталёўцаў, будаўнікоў і рабочых хімікаў. Гэткія-ж дэлегацыі ў СССР арганізуюцца ў Нарвэгіі, Фінляндыі і Эстоніі.

Распрацован плян.

ЛЁНДАН, 12-8. Дыпляматычны агляльнік «Сэндэй Таймс» паведамляе, што вайсковае міністэрства ўжо распрацавала плян эвакуацыі ангельскага акупацыйнага войска з Рэйнскае вобласьці, бо ангельскі ўрад жадае, каб акупацыя была спынена ў наблізкі час.

ПАСТАНОВА ЦВК І СНК БССР

ПРА КАНКРЭТНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ ПАЛЕПШАНЬНЯ ПРАЦЫ СЯРОД ДЗЯЦЕЙ

Ажыцьцяўленьне в посьпехам задач гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы ў горадзе і ў вёсцы патрабуе ад усіх органаў савецкай улады максымальнай увагі да забясьпечаньня правільнага клясавага выхаваньня дзяцей працоўных і падрыхтоўкі з іх палітычна-сьвядомай, здаровай і камуністычна-выхаванай зьмены.

Бяручы паказанае вышэй пад увагу, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Абавязаць усе савецкія органы ўзмацніць сваю ўвагу і практычную дапамогу камуністычнаму дзіцячаму руху і ўжыць шэраг практычных мерапрыемстваў для масавага ўкараненьня сярод дзяцей працоўна-тэхнічных навыкаў і ведаў, палепшаньня палітычнага і культурнага выхаваньня і аховы здароўя дзяцей.

2. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі разам з Народным Камісарыятам Асьветы арганізаваць у 1930 годзе ў г. Менску Цэнтральную Піанэрскую Тэхнічную Станцыю, якую ВСНГ павінен забясьпечыць тэхнічнымі сіламі і абсталяваньнем.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Народнаму Камісарыяту Земляробства арганізаваць у 1930 годзе пры Горацкай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі па каштарысу Акадэміі Цэнтральную Піанэрскую Сельска-Гаспадарчую Станцыю.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы падаць у СНК не пазьней 1-га верасьня г. г. канкрэтныя прапановы аб арганізацыі сельскіх школ і дзіцячых дамоў, якія знаходзяцца ў сельскіх мясцовасьцях.

5. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства дапамагаць піанэрскім атрадам у іх сельска-гаспадарчай рабоце і забясьпечваць іх на льготных умовах насеньнем і штучным удабрэньнем для вытворчых работ на школьных і іншых вучастках.

6. Даручыць Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву арганізаваць аддзел для выданьня дзіцячай літаратуры і пашырыць выданьне дзіцячых кніжак, асабліва па пытаньнях інтэрнацыянальнага і антырэлігійнага выхаваньня, дзіцячага камуністычнага руху, навукова-тэхнічных ведаў, сельскай гаспадаркі, аховы здароўя і рэжыму працы і адпачынку, а таксама ўжыць рашучыя захады для патаньненьня гэтых выданьняў.

7. Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам разам з Народным Камісарыятам Асьветы вылучаць фонды для забясьпечаньня дзяцей беднаты інтэрнатамі і стыпэндыямі да пачатку навучальнага году і дабіцца ў 1929-30 г. ахопу школаю ўсіх дзяцей беднаты.

8. Даручыць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для палепшаньня работы па ахове здароўя дзяцей і ў паасобку піанэраў.

9. Даручыць Вышэйшаму Савету Фізычнай Культуры арганізаваць у 1930 годзе ва ўсіх акруговых цэнтрах акруговыя курсы для фізкультурнай падрыхтоўкі правадыроў атрадаў юных піанэраў.

10. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і акруговым выканаўчым камітэтам забясьпечыць майстэрнямі ўсе піанэрскія клюбы і павялічыць выдаткі на папаўненьне дзіцячаю літаратураю дзіцячых бібліятэк і дзіцячых аддзелаў пры ўсіх клюбах і бібліятэках.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР Карп.

Час. Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўч. Камітэту БССР Вараўка.

12-га жніўня 1929 г. гор. Менск.

Барацьба пралетарыяту з буржуазеяй.

АРЫШТЫ НЯ СПЫНЯЮЦЦА.

ПАРЫЖ, 12-8. Учора арыштаваны акруговы сэкратар рэвалюцыйнага друку, былы ўдзельнік вайны Дзюкле і сэкратар арганізацыі чырвонага фронту Ляно. Дзюклё, які зьяўляецца інвалідам, вызвален. Ён абвінавачваецца ва ўдзеле ў змове супроць безапаснасьці дзяржавы.

Папраўчы суд прысудзіў да зьняволеньня на 13 месяцаў прафсаюзных сэкратароў і да зьняволеньня на 3 месяцы работніцу, матку 3-х дзяцей за «зьнявагу паліцэйскіх» у час маніфэстацыі 1 жніўня.

Руку салдата не накіраваць на рабочага.

ПАРЫЖ, 9-8. «Юманітэ» ня спыняе публікаваць паведамленьні з правінцый аб маніфэстацыях, якія адбыліся 1 жніўня. У Шахтрэ была праведзена забастоўка, ахапіўшыя ўсе мэталёвыя прадпрыёмствы. Ня гледзячы на паліцэйскія меры, на вуліцах гораду адбылася маніфэстацыя. На даху сабору быў вывешаны чырвоны сьцяг.

Далей „Юманітэ" друкуе карэспандэнцыю з Валанцьера, у якой паведамляе, што там 1 жніўня адбылася вельмі буйная маніфэстацыя. Баставала 75 проц. гарнякоў. Пры выхадзе з фабрык увечары адбылася маніфэстацыя, у якой прымалі ўдзел паўтары тысячы рабочых. Была сутычка з паліцыяй. Афіцэры загадалі салдатам узяць на прыцэл. Салдаты было паслухаліся, але зараз-жа апусьцілі вінтоўкі.

Змагайцеся за рэвалюцыйны ўрад.

ЛЁНДАН, 12-8. ЦК ангельскай кампартыі зьвярнуўся з адозвай да рабочых лянкашырскай баваўнянай прамысловасьці з заклікам рашуча абараніцца ад наступу капіталістаў, даць адпор спробам скарачэньня заработку пры дапамозе арбітражу.

Адозва прананує арганізоўваць камітэты па барацьбе з лёкаутам сярод радавых рабочых з тым, каб гэтыя камітэты праводзілі барацьбу пад кіраўніцтвам кампартыі.

Адозва высоўвае наступныя лёзунгі: „Прэч рабочы ўрад рацыяналізацыі", „Змагайцеся за рэвалюцыйны ўрад рабочых"

400 тысяч беспрацоўных не атрымліваюць ніякай дапамогі.

БЭРЛІН, 10-8. Агульна-нямецкі камітэт беспрацоўных узбудзіў пытаньне аб мяркуемым пагоршаньні сацыяльнага страхаваньня беспрацоўя і пастанавіў мабілізаваць усіх беспрацоўных і рабочых на прадпрыемствах для агульнай барацьбы супроць такіх тэндэнцый.

У выпушчанай адозве камітэт канстатуе, што ўжо зараз налічваецца 400.000 беспрацоўных, якія не атрымліваюць дапамогі. Камітэт заклікае беспрацоўных абіраць з свайго асяродку камітэты, якія павінны працаваць у кантакце з фабзавкомамі.

САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАМ НЕ ЎДАЛОСЯ.

БЭРЛІН, 12-8. Дзень нямецкай канстытуцыі прашоў па ўсёй Нямеччыне пад адзнакай адзінага антыкамуністычнага фронту буржуазных партый і сацыял-дэмакратыі. Сацыял-дэмакраты, якія адыгрывалі кіруючую ролю ва ўсіх парадах, стараліся надаць учарайшым выступленьням яскрава выяўлены антысавецкі характар.

Галоўнаю дзейнічаючаю асобаю быў учора «Саюз Рэспубліканскага Сьцягу» большасьць членаў якога складаецца з сацыял-дэмакратаў. Кіраўнікі саюзу заявілі, што ў яго выступленьні ў Бэрліне прымуць удзел 150 тысяч чалавек; аднак, у сапраўднасьці лік удзельнікаў быў значна меншы. Калі забаронены саюз чырвоных франтавікоў арганізоўваў раней свае дэманстрацыі, дык франтавікі заўсёды ішлі паміж шчыльнымі шэрагамі віншаваўшых іх рабочых, наадварот „Саюз Рэспубліканскага Сьцягу" праходзіў учора ў рабочых кварталах Бэрліну па пустых вуліцах. Толькі ў цэнтры гораду невялікія групы ішлі за дэманстрацыяй прычым вельмі часта гэтыя групы складаліся з рэвалюцыйных рабочых, якія ў рэзкіх выгуках выяўлялі свае адносіны да буржуазнай рэспублікі і да славячага яе „Саюзу Рэс...

Задуманая з правакацыйнаю мэтаю дэманстрацыя на Дзюлоф-Пляц супроць дому кампартыі прайшла спакойна, бо камуністы выявілі жалезную вытрымку; рабочая варта дому здолела папярэдзіць сутычкі, ня гледзячы на тое, што дружыньнікі «Саюзу Рэспубліканскага Сьцягу» усяк стараліся справакаваць іх кідаючы ў дом пустыя бутэлькі і г. д.

На доме камуністычнай партыі калыхаўся чырвоны сьцяг. На вялікіх плякатах было напісана: **«Цяперашняя рэспубліканская канстытуцыя азначае дыктатуру буржуазеі, савецкая канстытуцыя азначае дыктатуру пралетарыяту».**

Ня гледзячы на забарону паліцыі, у розных раёнах Бэрліну да позьняй ночы стыхійна ўзьнікалі рабочыя контрдэманстрацыі. Ва ўсіх такіх вы

ЧЫСТКА ПАРТЫІ І САВЕЦКАГА АПАРАТУ

Даем адпор былым людзям.

(Латыгаліцкая ячэйка КП(б)Б, Халопеніцкага раёну).

Ячэйка ніякай падрыхтоўчай працы не вяла і вёскі аб чыстцы нічога ня ведалі. Беднота была непадрыхтавана, таму бедната мала прымала ўдзел у чыстцы шэрагаў партыі. Становішча ячэйкі нездаровае, яна не карыстаецца належным аўтарытэтам сярод насельніцтва. Ячэйка складаецца з 3 членаў і 1 канд. Палітычна няпісьменны, ня могуць арыентавацца ў палітычных пытаньнях. З апошнімі дырэктывамі партыі не знаёмы, а калі прапрацоўваюць, дык паверхнасна. Былы сэкратар ячэйкі Ліцьвінаў Ананас і старшыня с.-савету Харкоўскі выключаны з шэрагаў КП(б)Б Менскай АКК і знаходзяцца ў спраўдоме за п'янства і за падлог. У яч. яшчэ засталіся карэньні гнойніка. Крытыка і самакрытыка не адчуваецца, быў некаторы зажым, замазваньне фактаў разлажэньня асобных членаў ячэйкі. Камісія адзначыла дрэнныя ўзаемаадносіны паміж ячэйкай і мясцовай інтэлігенцыяй, з прычыны чаго не вялася культурнаасьветная праца; у ячэйцы была замкнутасьць, не давяралі праводзіць настаўніцтву культурна-асьветнай, антырэлігійнай працы. Ячэйка праводзіла зачыненыя сходы. У некаторых вёсках сялянне ня ведалі нават што ёсьць ячэйка.

5 ліпеня г. г. у памяшканьні сельсавету сабралася сялянства больш, чым 150 чал. на сход па чыстцы. Старшыня камісіі зрабіў даклад аб задачах і чыстцы партыі; асабліва застанавіўся на ўдзеле працоўнага насельніцтва ў чыстцы шэрагаў партыі. Потым зрабіў даклад сэкратар ячэйкі, які сказаў, што толькі цяпер абраны і ніякай працы да гэтага часу ня вёў.

Па дакладу было задана 21 пытаньне. У спрэчках выказалася 16 таварышоў. Неабходна адзначыць, хто паказаў свой твар у спрэчках заўсёды больш хвалілі сябе, а ганьбілі асобных таварышоў—гэта Казыра Варфаламей б. член КП(б)Б з 1917 г., сябра б. Барысаўскага ўіспалкома, выключан з партыі за п'янства, сувязі з напамі. У сучасны момант жыве ў Латыгалічах, зямлю здаў у арэнду, працаваць ня хоча, састаіць сябрам саюзу, хоча атрымліваць па безрабоціцы грошы.

У гэтым годзе інспэктар нарасьветы Халопеніцкага РВК накіраваў яго настаўнікам лікбезу, зіму прасядзеў і ніводнага вучня ня выпусьціў, ходзіць па вёсцы і сялянам пагражае.

Каго вычысьцілі: Жук Васіль канд. з 1927 г., селянін, партспагнаньню не падлягаў, меў вымову за п'янства, пасьля вымовы ня справіўся, скрыўляў клясавую лінію працуючы старшынёй СКУ, называў беднякоў гультаямі, больш трымаў сувязь з заможнымі, выключан з шэрагаў КП(б)Б. Гэту канд. падкулачнікі хвалілі. Былі галасы: „Добры хлопец, трэба заставіць у партыі".

Правяраецца старшыня с.-с. Казыра Ўлас, сябра КП(б)Б з 1926 г., беларус, б. чырвонаармеец, мае вымову за п'янства, з працай с.-с. не спраўляецца, палітычна малапісьменны, не карыстаецца аўтарытэтам сярод сялянства, нацягнутыя ўзаемаадносіны з інтэлігенцыяй, абвінавачваецца ў рэлігійным абрадзе (хрысьціў дзяцей), выключан з шэрагаў КП(б)Б.

Камісія адзначыла шэраг недахопаў і намеціла новыя мерапрыёмствы ў палепшаньні працы ячэйкі і ажыўленьні ў кіраўніцтве працай з боку райкому КП(б)Б.

Працоўнае насельніцтва адобрыла мерапрыёмствы камісіі і прасіла камісію зьвярнуць асаблівую ўвагу на культурную працу с.-с. і адчыненьне з бюджэтнага году хаты-чытальні, а таксама замяніць маючагася фэльчара больш кваліфікаваным.

Селькор.

Аздаравілі ячэйку.

(М. Росіца, Дрысенск. р., Полацк. акр.)

Заўсёды Росіцкая ячэйка ў сваёй рабоце перажывала шмат перашкод і недахопаў.

Шмат спраў і карэспандэнцый было зьмешчана пра асобных яе кіраўнікоў.

Яшчэ ў мінулым годзе Росіцкая ячэйка за яе склочнае становішча фігурыравала ў справах на Полаччыне. Яшчэ ня так даўно ўся округа адзначыла ганебны выпадак, калі партыйцы і кіраўнікі крэдыткаапэрацыі крэдытавалі паноў і кулакоў насельнем.

Прайшоўшая падрыхтоўчая работа да чысткі і сама чыстка выкарчавалі з яе шэрагаў усё дрэннае і перашкаджаючае ў рабоце і жыцьці ячэйкі. На сяньняшні дзень твар ячэйкі зьмяніўся.

Ад каго аслабанілася ячэйка? Ад п'яніц, трымаючых сувязь з заможным элемэнтам, ад скрыўляючых клясавую лінію, халатна адносячыхся да справы, ад адарваўшыхся ад партыі.

Напрыклад: Каласоўкі, калі яму прапанавала ячэйка падумаць аб калектывізацыі, дык ён ня толькі не падумаў аб гэтым, але ў сваёй вёсцы, дзе працу па калектывізацыі праводзіў беспартыйны дэмабілізаваны чырвонаармеец, імкнуўся сарваць яе.

Аднак, з ім справа ня толькі ў калектывізацыі, але ў тым, што ён зросься з заможнымі, сыстэматычна п'ян ставаў і, скарыстоўваючы сваё становішча, імкнуўся атрымаць як мага больш лесу.

Другім ня менш прыкметным „тузам", якога пачысьцілі—гэта Урбан. Ён быў старшынёй сельсавету. На сваёй пасадзе таксама „праявіўся", даючы былым паліцэйскім даведкі; скрыўляў клясавую лінію, даваў льготы заможным; ігнараваў работу групы беднаты і калі трэба было якое пытаньне ўзгадніць—ён „узгадняў", пісаўны ад сябе пратакол групы беднаты з сваімі пастановамі і нарэшце адарваўся ад ячэйкі, адмовіўшыся выконваць яе заданьні.

Урэшце,—Ерховіч. Яго трэба характэрызаваць балястам у партыі.

Ён бухгальтар у крэдытным т-ве і, сказаць, каб быў добрым бухгальтарам, ніхто ня скажа акрамя таго, што за ім наглядалася сымуляцыя, халатнасьць і нежаданьне працаваць.

Ён любіў выпіць і пайсьці на вячорку.

Сходы ячэйкі і абавязкі былі незнаёмамі рэчамі для гэтага чалавека.

Ад іх ячэйка аслабанілася.

З 12 выключана 3 і 3 вынесены розныя спагнаньні.

Чысткаю ў яч. паложан канец тым непаразуменьням, склокам і неспрацаванасьці, якія мелі сваю гісторыю на працягу цэлага году яе працы. **Л.**

Вынікі праверкі Забашэвіцкай ячэйкі.

(Барысаўскі раён).

Чыстка прайшла пры актыўным удзеле беднаты, с.-г. рабочых і серадняцтва. Камісіяй выяўлена шэраг адмоўных бакоў у працы ячэйкі. Камісія дала рад практычных указаньняў у далейшай працы ячэйкі. Гэтыя практычня ўказаньні вельмі каштоўны для партячэйкі.

Праверка і чыстка партячэйкі аздаравіла яе склад, што дае магчымасьць у далейшым работу ячэйкі паставіць на належную вышыню. Бо дзякуючы тым прымазаным і нягодным элемэнтам, з ідэалёгіей чуждай для партыі, працу ячэйкі цяжка было наладзіць як належа быць.

Камісія выкінула ўсіх тых, хто перашкаджаў партыі, усіх тых, хто ашукваў партыю, хто скрыў ад партыі сваё мінулае.

Хто такія, каго партыя не павінна трымаць у сваіх шэрагах? Першы—Невяроўскі Стась, дэзэртыр, не хацеў служыць у Чырвонай арміі, самагоншчык, скрыўляў клясавую лінію, трымаў сувязь з заможнікамі, мала ўвагі зварачваў на беднату, забараняў сваіх радных—заможных. На працягу ўсёй праверкі хацеў камісію ашукаць.

Другі—Ржавуцкі Антон з сям'і чуждай партыі і сав. улады. Бацька яго трымаў сувязь з бандытамі. Дэзэртыр Чырвонай арміі, схаваў зямлю ад вучоту аб'ектаў абкладаньня, трымаў сувязь з заможнікамі-раднымі і г. д.

Трэці—Пашык Міхась—скрыўляў лінію партыі, перашкаджаў правядзеньню ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў партыі і ўлады. Элемэнт чужды для партыі. У дзень сьмерці Ул. Леніна наняў музыкантаў і ўстроіў вечарынку. Бацька—моцны серадняк.

Вось галоўныя „цэнтральныя фігуры" Забашэвіцкай ячэйкі, якія ўступілі ў партыю для кар'еры, хацелі замазаць сваё цёмнае мінулае і гэтым самым скарыстаць партыю для карысных мэт. Камісія весьма правільна зрабіла, што такіх прымазаных і чуждых партыі элемэнтаў вычысьціла з партыі. Насельніцтва бядняцкае і серадняцкае са здавольненьнем сустрэла такую пастанову камісіі. Выключэньне гэтых людзей дасьць у шэрагі партыі лепшых абаронцаў беднаты і батрацтва, лепшых будаўнікоў нашай краіны, бо прыбываньне ў партыі падобных Невяроўскіх, Ржэвуцкіх і Пашыкаў служыла тым тормазам, што росту ячэйкі ня было. **Прысутны.**

Растратчыкі скарбавай маемасьці.

Пры будаўніцтве Валешынскай школы, Капыльскага раёну існуе будаўнічая камісія, выбрана ад насельніцтва. Увесь час каля будаўніцтва гінулі матар'ялы.

Насьля пакрыцьця жэсьцяй школы, асталося яшчэ некалькі лістоў. Члены будаўнічай камісіі Улаской Мікалай, Кавалеўскі Тамаш, Несьцяр Кастусь і настаўнік Вяляшынскай школы Маліноўскі М. па свайму загаду заказалі арасільнічыкам з м-ка Копыля, каб тыя парабілі ім каструлі з астатку бляхі. Гэта баявы загад начальства на будаўніцтву выканан на 100 проц. Ім былі зроблены формы і заслонкі. Гэты факт выкрыў тэхнік Капыльскага РВК Хатэнка. Быў складзен пратакол і справа накіравана ў нарсуд.

Гэта дасьць магчымасьць зьнішчыць усю кражу, зажымы, загады на казённую маемасьць і ўсякае злачынства па будаўніцтву 2 камплектавай школы. **Зорні.**

Працоўнае насельніцтва дапамагае партыі ў чыстцы.

(Луначарская яч. КП(б)Б, Баркавіцкага р., Полацкай акр.).

Ячэйкай была праведзена вялікая падрыхтоўчая работа да чысткі, а разам з гэтым шырока было абвешчана насельніцтва, якое прышло за 8-10 вёрст да месца, дзе праходзіла чыстка.

Каля хаты-чытальні сядзелі сяляне і сялянкі.—Ці скора пачнецца гэта чыстка?—пыталіся яны адзін у другога. Радам сядзеўшы сусед з насьмешкай адказаў:

— «Няхай падрамантуюць трыер, каб добра чысьціў»..

Старшыня праверачнай камісіі т. Якобсон зрабіў даклад аб значэньні чысткі і ўдзелу працоўных па праверцы і чыстцы шэрагаў партыі.

Сакратар ячэйкі т. Хлудкоў зрабіў справаздачу аб рабоце ячэйкі. Ячэйка ў сучасны момант карыстаецца сярод сялянства і яўрэйскай беднаты вялікім аўтарытэтам. Калі раней паасобнымі сябрамі партыі ўжывалася п'янка, дык цяпер гэта зьнішчана. Ячэйкай праведена вялікая работа сярод беднаты. Беднота амаль што ўся каапэравана. Тыднёвік ураджайнасьці па сельсавету, дзякуючы ініцыятыве ячэйкі, прайшоў здавальняюча.

Калектывізацыя па сельсавету таксама, дзякуючы ячэйкі, праходзіць досыць посьпяхова: беднота і некаторыя нават заможныя сяляне падаюць заяву аб уступленьні ў калгасы.

Але побач з вялікімі дасягненьнямі ў рабоце ячэйкі маюцца і недахопы. Ячэйка не змагла належным чынам разгарнуць масавай работы сярод сялянства, адсутнічае кіраўніцтва рознымі грамадзкімі таварыствамі і арганізацыямі, адсутнічае работа сярод жанчын.

Правяраецца тав. Кабылінскі—сябра партыі з 1920 году, беларус, селянін-хлебароб, на досыць вытрыманы партыец, у хаце вісяць абразы, палітычна амаль што зусім няпісьменны. Камісія паставіла яму на від.

Далей тав. Латыр Ягор—селянін-серадняк. Падтрымоўвае кулакоў. У часе перавыбараў кулакі высоўвалі ў склад сельсавету. Арганізаваў машыннае т-ва і сам-жа яго распусьціў,—машыны прадаў свайму сваяку кулаку, які абкладзен індывідуальным падаткам у суме 200 р. Выключан камісіяй з шэрагаў КП(б)Б.

Левін Румка. Канд. з 1928 г. па нац. яўрэй, сын былога банкіра і гандляра, пралез у партыю выпадкова. Мае сувязь з клясава-чуждым элемэнтам за мяжой. Замешан у кантрабандзе—выключан з шэрагаў партыі.

Собаль Іван сябра партыі з 1919 г. за п'янства і за нядосыць чыстае правядзеньне клясавай лініі—аб'яўлена вымова.

Трэба адзначыць, што сход прайшоў надзвычайна актыўна, батрацтва і беднякі задавалі вельмі сур'ёзныя пытаньні і ўвесь час дапамагалі праверачнай камісіі выявіць сапраўдны твар кожнага партыйца. **І—ко.**

Я раблю па закону(?!)

(Зеляноцкі с.-с., на Мазыршчыне).

Гр-н в. Зеляноча Цімашэнка просіць сэкратара сельсавету тав. Хадзькова Янку выключыць з ліку едакоў яго бацькі яго сям'ю ў пяць асоб. Або няхай маёй сям'і хлеб бацька дае, або выключ яе з яго едакоў—няхай не карыстаецца чужымі едакамі на дурніцу—кажа Цімашэнка.

— Я раблю па закону і выключыць цябе не магу пакуль мне не скажа Райземкамісія—адказвае „законавед" Хадзькоў.

— Падайце заяву ў райённую падатковую камісію і яна выключыць,—раюць Цімашэнку з боку сяляне.

— Для нас падатковая камісія не закон і яе пастанову мы не прызнаем—адказвае Хадзькоў.

— Вы-ж калі выключыце яго сям'ю, дык па руб. 30 падатку больш возьмеце—падказываюць з боку сяляне.

— Нам падатак вялікай ролі ня грае, а нам самае галоўнае закон, а згодна закону выключыць нельга—цэдзіць Хадзькоў.

Даведка: Нарсудом Цімошчанка аддзелен ад свайго бацькі. Яму прысуджана частка рухомай маемасьці, якую ён атрымаў і зараз працуе па найму.

Ці ня варта за гэта „законаведа" Хадзькова абліць хваляй самакрытыкі.

В. Л. Лявонік.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРЭЗЫДЫУМУ І ПАРТКАЛЕГІІ ЦКК КП(б)Б

аб ходзе чысткі і праверкі вайсковых і вясковых ячэек КП(б)Б.

1. Праверка і чыстка вясковых і вайсковых ячэек КП(б)Б праходзіць у асноўным ня пры дастатковым наведваньні праверачных сходаў членамі і канд. партыі, зацікаўленасьці ў актыўным удзеле на гэтых сходах членаў ЛКСМБ, сел.-гасп. рабочых, беднаты, лепшай часткі серадняку, а ў вайсковых арганізацыях—чырвонаармейцаў, так і пры шырокім разгортваньні самакрытыкі, у асаблівасьці ў тых ячэйках, дзе добра пастаўлена масавая работа, правільна праводзіцца клясавая лінія партыі ў штодзённай рабоце ячэек і праведзена добрая папярэдняя падрыхтоўка да чысткі.

2. Побач з гэтым ЦКК КП(б)Б лічыць зусім ненармальным, што ў шэрагу мейсц. у зьвязку з слабай падрыхтоўкай некаторых ячэек і РК да чысткі і праверкі, а таксама і наогул ўсіх слабай работы, разгортваньне самакрытыкі ўсё яшчэ застаецца недастатковым і нават слабым, а ў шэрагу ячэек наглядаліся зьявішчы „кругавой паруці" і сямейственага пакрываньня недахопаў ячэйкі і асобных партыйцаў. ЦКК КП(б)Б таксама лічыць зусім недапушчальным, калі з боку паасобных РК (Смалявіцкі і Заслаўскі—Менск. акр., Ліозьненскі—Віц.акр., Чачэвіцкі—Маг. акр., Крупскі—Аршанск. акр., Петрыкоўскі—Мазырск. акр. і інш) ня былі прыняты належныя меры па растлумачэньню шырокім масам, асабліва батрацтву і беднаце, задач партыі па чыстцы і праверцы, у выніку чаго на некаторых праверачных сходах батрацтва і беднота выступалі неарганізавана і па сваёй актыўнасьці ня былі начале беспартыйных мас, удзельнічаючых на праверохадах, што дало магчымасьць імкненьню заможных элемэнтаў да кампрамэнтацыі паасобных партыйцаў, якія цьвёрда праводзяць клясавую лінію партыі.

3. ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ў рабоце РК і ячэек не ва ўсіх мясцох зварочваецца дастатковая ўвага пытаньням вярбоўкі ў партыю с.-г. рабочых, батрацтва і беднаты і што з боку АК і АКК няма належнай праверкі і практычнай дапамогі па выкананьню РК і ячэйкамі раней дадзеных ЦК і ЦКК КП(б)Б дырэктыў па пытаньню росту партыі. У выніку гэтага, нягледзячы на тое, што чыстка і праверка вясковых ячэек падыходзіць да канца, належнага пералому ў гэтай рабоце, за малым выключэньнем, яшчэ ня маецца. Больш таго, у шэрагу мейсц нават у райённых працаўнікоў існуе думка, што ў іх „батракоў няма".

4. Адзначаючы, што праверкомы з работай па чыстцы і праверцы вясковых і вайсковых ячэек у асноўным спраўляюцца, ЦКК КП(б)Б разам з гэтым падкрэсьлівае наступныя недахопы ў іх рабоце—слабы вучот прысутнічаючых на праверсходах па сацыяльным групам (батрак, бядняк, серадняк), слабае вывучэньне актыўнасьці паасобных сац. груп з боку паасобных праверкомаў, недастатковае глыбокае вывучэньне і праверка работы ячэек, незаўсёды вычэрпываючая праверка пададзеных заяў і матар'ялаў на праверваемых партыйцаў, у зьвязку з чым маюцца факты значных зьмен пастаноў праверкомаў у асобных АКК. Гэтыя недахопы ў рабоце паасобных праверкомаў зьяўляюцца вынікам недастатковага жывога інструктаваньня і дапамогі з боку АКК і АК праверкомам у працэсе чысткі і праверкі.

5. ЦКК КП(б)Б адзначае два выпадкі меўшай месца адмены работы двух праверкомаў па дзьюх вайсковых ячэйках і назначаньне новай праверкі (Полацкая), што зьявілася вынікам слабай падрыхтоўкі да чысткі і праверкі гэтых ячэек, слабай работы праверкомаў і несваечасовай дапамогі ім з боку АКК, несцвярэньня спрыяючых умоў да чысткі і праверкі з боку кіруючага палітскладу праваряўшайся арганізацыі, на што трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу адпаведным вайсковым паліторгам.

У мэтах спраўленьня выяўленых недахопаў у далейшай рабоце па чыстцы і праверцы,—аб'яднанае пасяджэньне Прэзыдыуму і Парткалегіі ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. АКК, АК і РК КП(б)Б прыняць усе меры па выяўленьню ў сябе вышэйпералічаных недахопаў і хутчага іх зжываньня, для чаго камандыраваць адказных прадстаўнікоў АК і АКК у райёны для жывога інструктаваньня і практычнай дапамогі праверкомам. Пры гэтым зьвярнуць асаблівую ўвагу, праверкомаў, пры непасрэдным і актыўным удзеле РК і ячэек, на неабходнасьць таго, каб батрацтва і беднота на ўсіх праверачных сходах выступала арганізаванай і была на чале актыўнасьці па выяўленьню хворыт зьявішч у рабоце, як ячэек у цэлым, так і паасобных партыйцаў, пры гэтым праводзіць вывучэньне і вучот палітычнай актыўнасьці паасобных сац. груп (батрак, бядняк, серадняк).

2. АК і РК партыі дабіцца рашучага пералому ў выкананьні дырэктыў ЦКК КП(б)Б па пытаньню вярбоўкі ў партыю рабочых, батрацтва і беднаты, для чаго ўзмацніць масавую ячэйкавую работу. АКК праверыць выкананьне гэтай дырэктывы.

3. Улічваючы тое, што чыстка і праверка на вайсковых і вясковых ячэек выяўляе побач з станоўчымі момантамі, многія хворыя зьявішч—ня толькі пастаянна масавай работы, асабліва ў вясковых ячэйках, слабае разгортваньне самакрытыкі, у большасьці райёнаў слабае ўлічэньне і абстаўленьне ў партыю батрацтва, рабочых і беднаты і калгасьнікаў, зусім слабае вывучэньне і практычная дапамога з боку РК у рабоце ячэек і г. д.—АКК і АК рэалізаваць вынікі чысткі і праверкі ў напрамку спраўленьня выяўленых праверкомамі недахопаў і замацаваньня актыўнасьці мас, для чаго зараз-жа прыступіць да вучоту, падагуленьня і аналізу вынікаў праверкі вясковых і вайсковых ячэек, паставіць іх на шырокае абгаворэньне пленумаў АК, АКК і партактываў.

4. Улічваючы слабую папярэднюю падрыхтоўку да чысткі і праверкі вясковых ячэек (характарыстыкі і інш. матар'ялы ў большасьці не адпавядалі сапраўднаму становішчу ячэек), што ўскладняла работу праверкомаў,—КК, АКК і РК зарэкамендавалі прыступіць да праверкі падрыхтоўкі сл. ячэек і ячэек навучальных устаноў да чысткі.

5. Адзначаючы паасобныя выпадкі помсты і ганеньня з боку вычашчаных з партыі, альбо атрымаўшых спагнаньне ў вяносінах да партыйцаў, альбо беспартыйных, якія выкрывалі іх у час чысткі (забойства выключаным у Чэрвенск. раёне сям'і)—ЦКК КП(б)Б зварочвае ўвагу ўсіх АКК, АК і РК, а таксама ўсіх партыйцаў аб неабходнасьці рашучай барацьбы з падобнага роду выпадкамі.

ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ў апошнім выпадку ганеньня і помсты, у якім бы яно форме не выяўлялася, неабходна вінаватых прыцягваць да самай суровай адказнасьці з перадачай справы ў суд.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Рыхтуемся да дню калектывізацыі.

(Ад нашага Бабруйскага карэспандэнта).

Дзень калектывізацыі, які будзе праведзен 19 жніўня, зьявіцца днём практычнай агітацыі за калгасаўскае будаўніцтва, будзе днём агітацыі і прапаганды барацьбы за лепшы ўраджай у сувязі з надыходзячай васеньняй пасеўнай кампаніяй.

На сялянскіх сходах у вёсцы самі калгасы шляхам пастаноўкі дакладаў раскажуць аб выніках калектыўнае працы, масавыя сялянскія экскурсіі, што будуць наладжаны ў калгасы, відавочна пакажуць сялянству пераважнасьць калектыўнае гаспадаркі перад адзінаасобнай.

У калгасы будуць арганізаваны экскурсіі сялян, рабочых, чырвонаармейцаў, школьнікаў і г. д.

Уся савецкая грамадзкасьць у гэты дзень ідзе на практычную дапамогу калгасам. Арганізацыі гораду ў гэты дзень прымуць шэфства над калгасамі. У гэты дзень калгасы, якія яшчэ ня ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва, зробяць гэта, заключыўшы належныя дагаворы.

Гэты дзень зьявіцца і днём праверкі працы ўстаноў у галіне калектывізацыі. І па прыкладу дню індустрыялізацыі ў гэты дзень будзе арганізован фонд калектывізацыі шляхам наладжваньня працоўнымі суботнікаў і шляхам арганізацыі збору сродкаў у гэты фонд. Фонд гэты будзе скарыстан на культурна-бытавыя і гаспадарчыя патрэбы калгасаў.

Апрача таго, каб прыцягнуць грамадзкую ўвагу да справы калектывізацыі, яшчэ шырэй у гэты дзень будзе разгорнута шырокая праца па арганізацыі „гурткоў прыхільнікаў калектывізацыі". Такія гурткі будуць арганізаваны пры прадпрыёмствах, клюбах, хатах-чытальнях, ячэйках КСМ, прафарганізацыях і г. д.

У сучасны момант ідзе шпаркая падрыхтоўка да правядзеньня гэтага дню. У гэты дзень будзе аддадзена вялікая ўвага арганізацыі новых калгасаў і стварэньню новых вытворчых каапэратыўных аб'яднаньняў.

Гледзячы па таму значэньню і падрыхтоўцы, якая вядзецца, дзень калектывізацыі зьявіцца працоўным сьвятам усяго каапэраванага сялянства, прыцягне да сябе ўвагу ўсіх працоўных.

А. Дамброўскі.

Пабудова дрэваапрацоўчага камбінату.

Гомель, 10-8. У Нова-Беліцы пачалася пабудова дрэваапрацоўчага камбінату, які будзе складацца з абсушнага і паркетнага цэхаў і з цэху гатовай мэблі. На будаўніцтва і абстаўленьне камбінату мяркуецца адпусьціць да 5 міліёнаў руб.

Камбінату адведзена плошча ў [illegible] гэктараў і мяркуецца пабудаваць [illegible] сілавую станцыю моцнасьцю ў 10[illegible] кілёват. На камбінаце будзе заняты больш 1000 рабочых. Уся вытворчасьць будзе мэханізавана.

Рыхтуем новых працаўнікоў.

Полацак, 10-8. Ня так даўно [illegible] чыліся акруговыя курсы старшынь сакратароў сельскіх саветаў, на якіх займалася 90 асоб. Курсы прапрацавалі бягучыя пытаньні працы [illegible] вёсцы, што патрэбна рабіць у сучасны пэрыяд, калі разгортваецца шырокае сацыялістычнае будаўніцтва, як у горадзе, таксама і ў вёсцы.

Курсы прайшлі вельмі добра [illegible] вялікай актыўнасьці ўдзельнікаў.

Курсы трактарыстых.

Полацак, 10-8. Акруговы інспэктарыят нарасьветы з 1 кастрычніка адчыняе ў Экіманьскай сельска-гаспадарчай камуне курсы па падрыхтоўцы трактарыстых, разьлічаныя на 1[illegible] асоб ня толькі з Полаччыны, але і інш. акруг Беларусі.

Зараз па райёнах пачалася падрыхтоўчая праца да прыёму на курсы. У першую чаргу прымаюцца батракі, калгасьнікі і беднякі.

За дзесяціну індустрыялізацыі.

(МАГІЛЕЎШЧЫНА).

Камунары з камуны «Серп і Молат», Амхініцкага сельсавету, Лупалаўскага раёну, на сваім агульным сходзе пры абгаварэньні пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва і індустрыялізацыі краіны, пастанавілі:

— Дзеля шпарчэйшага правядзеньня ў жыцьцё вызначанага будаўніцтва, у процівагу правакацыям сусьветных драпежнікаў - імпэрыялістаў—засеяць дзесяціну індустрыялізацыі краіны.

«Серп і Молат» заклікае ўсе камуны і арцелі Магілеўскай акругі насьледаваць яго прыкладу.

Хай лёзунг: «СССР павінен стаць мэталёвым»—хутчэй ператворыцца ў жыцьцё!

Л-ны.

НА УЗДЫМЕ.

(Вынікі X пленуму Выканкому Камінтэрну).

X пленум Выканкому Камінтэрну ўзяў пад аналіз тыя зьмены, якія адбыліся ў эканамічным і палітычным жыцьці з часу УІ кангрэсу Камінтэрну і прышоў да заключэньня, што гэтыя зьмены цалкам і поўнасьцю пацьвярджаюць правільнасьць асноўнага тэзісу УІ кангрэсу адносна дынамікі тэмпа насьляваеннага перыяду: „Гэты перыяд нямінуча вядзе, праз далейшае разьвіцьцё супярэчнасьцяў капіталістычнай стабілізацыі, да далейшага расхістаньня капіталістычнай стабілізацыі і да моцнага абвастрэньня агульнага крызісу капіталізму". Грунтуючыся на гэтым, X пленум Выканкому Камінтэрну пацьвердзіў у поўнай меры правільнасьць тактычнае лініі, намечанай УІ кангрэсам, канкрэтызаваў і завастрыў баявыя задачы кампартый адпаведна разгортваемым падзеям.

Дэбаты па першаму пункту парадку дню аб міжнародным становішчы былі прысьвечаны, галоўным чынам, характарыстыцы момантаў, расхіствачых капіталістычную стабілізацыю, і канкрэтызацыі выцякаючых з іх баявых задач кампартый. Адначасова з гэтым вялася па ўсёй лініі барацьба супроць тых яўных і скрытых, палахлівых, апартуністаў, якія замазваюць супярэчнасьці сучаснага капіталізму і спрабуюць цягнуць партыю назад, адступаючы перад цяжкасьцямі барацьбы.

Прыход да ўлады Макданальда, пакт Келёга, парыская рэпарацыйная згода,—усё гэта пацыфісцкая дымавая заслона, за якой вядзецца шалёная падрыхтоўка да вайны. Гэтая дымавая заслона аказвае ўплыў і на некаторыя няўстойлівыя элемэнты ў камуністычным лягеры, утвараючы ў іх пацыным лягеры, утвараючы ў іх пацы-

заслону і высьветліў сапраўднае становішча.

Падкрэсьліваючы правільнасьць тэзісу УІ кангрэсу аб завастрэньні супярэчнасьцяў паміж капіталістычнымі дзяржавамі, X пленум Выканкому Камінтэрну ў той-жа час падкрэсьліў, зноў-жа ў поўнай згодзе з рэзалюцыяй УІ кангрэсу, што галоўнай і найбольш непасрэднай небясьпекаю зьяўляецца небясьпека вайны супроць СССР—факт, які нахільны недаацэньваць некаторыя апартуністычныя элемэнты ў Камінтэрне, асабліва зараз, калі на парадку дню стаіць пытаньне аб аднаўленьні дыплёматычных зносін паміж Англіяй і СССР. Тэзісы X пленуму па гэтаму пытаньню гавораць: „Асноўная сусьветная супярэчнасьць паміж капіталістычным сьветам і СССР, як двума прынцыпіальна процілеглымі гаспэдарча-палітычнымі сыстэмамі, усё больш абвастраецца. Напад імпэрыялістаў на СССР зьяўляецца галоўнай небясьпекаю". У той самы час, як гэты тэзіс фармуляваўся, ён знашоў сабе яскравае пацьверджаньне ў злачынным нападзе нанкінскага ўраду на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы, справакаваным імпэрыялістычнымі дзяржавамі з мэтаю ўцягненьня СССР у вайну.

Аднэй з галоўных прычын наближэньня небясьпекі нападу на СССР зьяўляецца крушэньне надзей буржуазеі на капіталістычнае пераараджэньне Савецкага Саюзу і на ступнёвае падпарадкаваньне яго капіталістычнаму сьвету ў сувязі з пераходам СССР з аднаўленчага ў рэканструкцыйны пэрыяд. Кожны новы посьпех у справе індустрыялізацыі СССР наносіць удар капіталістычнай сыстэме. Адпаведна з гэтым X пленум надаў посьпехам у індустрыялізацыі СССР асаблівую ўвагу ў сувязі з пытаньнем аб расхістаньні стабілізацыі капіталізму.

Вялізарным дасягненьнем у справе сацыялістычнай рэканструкцыі ў СССР процістаяць глыбокія ўнутраныя супярэчнасьці ў капіталістым сьвеце, узьнікаючыя на глебе правядзеньня капіталістычнай рацыяналізацыі. X пленум зьвярнуў шмат увагі ўдакладненьню разуменьня капіталістычнай рацыяналізацыі і распаўсюджаньню розных апартуністычных аблудаў, зьвязаных з гэтым пытаньнем.

Вынік, да якога прыйшоў X пленум, гэта—неабходнасьць процістаўпіць мэтады сацыялістычнай рэканструкцыі ў СССР мэтадам капіталістычнай рацыяналізацыі буржуазных краін, супроць якой мы павінны весьці самую рашучую і бясспрэчную барацьбу.

Надзвычайна рэзкі адпор сустрэлі на X пленуме з боку нямецкіх і расейскіх таварышоў апошнія артыкулы тав Бухарына, у якіх ён сьцьвярджае, што дзякуючы панаваньню манапалісцкага капіталу сфэра канкурэнцыі выпінаецца ўнутры капіталістычных краін арганізаванай плянавай капіталістычнай гаспадаркай і што канкурэнтная барацьба там пераносіцца з унутры дзяржавы ў міжнародныя адносіны. На пленуме зазначана было, што гэты погляд тав. Бухарына—ня новага паходжаньня, што ён у свой час ужо сустрэў асуджэньне з боку тав. Леніна.

У сваей кнізе—„Эканоміка пераходнага пэрыяду" тав. Бухарын пісаў: «Фінансавы капітал скасаваў анархію вытворчасьці ўнутры буйна-капіталістычных краін». Тав. Ленін з краю аднаго экзэмпляру гэтай кнігі напісаў: „Не скасаваў". І на 1 кангрэсе Камінтэрну гэта думка тав. Бухарына знайшла свой адбітак у рэзалюцыі, ня гледзячы на пярэчаньні тав. Леніна, як апавядаў на пленуме ўдзельнік 1 кангрэсу тав. Куусінен.

На пленуме шмат увагі было аддана пытаньню аб навейшай эвалюцыі сацыял-дэмакратыі да сацыял-фашызму. Правыя і прымірэнцы, як вядома, адхіляюць сацыял-фашысцкае пераараджэньне сацыял-дэмакратыі. Яны тлумачаць гэта тым, што мэтады гвалтоўнага прыдушэньня рабочага руху ні ў якім разе ня новы дзеля пасьляваеннай сацыял-дэмакратыі, што іх у свой час дапасоўвалі шырока Носкэ і К-о, якіх, аднак, ніхто не называў яшчэ фашыстамі. Мэта гэтага сьцьверджаньня заключаецца ў тым, каб давесьці, што ніякіх істотных зьменаў у сацыял-дэмакратыі не ўтварылася за апошнія часы, што яна засталася такой-жа, якой была ў часе пасьля вайны, і што, адпаведна з гэтым, новы курс на завастрэньне барацьбы з сацыял-дэмакратыяй нічым не апраўдываецца. Гэта пазіцыя правых і прымірэнцаў зьяўляецца падтрыманьнем сацыял-дэмакратыі, якая і зараз выяўляе сябе „дэмакратычнай" партыяй, якая вядзе барацьбу, быццам, аднолькава на два фронты—супроць камунізму і супроць фашызму і якая спасылаецца на тое, што сам фашызм змагаецца, ня толькі супроць камуністаў, але і супроць сацыял-дэмакратыі, у чым ім падпяваюць правыя і прымірэнцы. На пленумах у шэрагу прамоваў рабіліся спробы ўдакладненьня разуменьня сацыял-фашызму, якое неабходна дзеля абвяржэньня апартуністычных сьцьверджаньняў правых і прымірэнцаў.

Канстатуючы ператварэньне сацыял-дэмакратыі ў сацыял-фашысцкую партыю, X пленум выканкому Камінтэрну адначасова падкрэсьліў асабліва шкодную і асабліва небясьпечную ролю, якую адыгрывае «левае» крыло сацыял-дэмакратыі.

Цэнтральнае месца займала на X пленуме пытаньне аб новым уздыме рабочага руху. Калі на УІ кангрэсе Камінтэрну гаварылася аб палявеньні рабочае клясы, дык за час, які аддзяляе нас ад УІ кангрэсу, рабочы рух прыняў такіх размах, што X пленум Выканкому Камінтэрну меў магчымасьць канстатаваць ужо „нарастаньне новага ўздыму рэвалюцыйнага рабочага руху". Гэта нарастаньне новага ўздыму асабліва ярка відаць зараз у Нямеччыне, Францыі, Польшчы, а з калёніяльных краіх,—у Індыі. Але элемэнты гэтага нарастаньня маюцца і ва ўсіх іншых краінах, не выключаючы і Англіі.

Наліччa новага ўздыму рэвалюцыйнага рабочага руху абвяргаюць правыя і прымірэнцы. Галоўны аргумэнт іх той, што ў 1926 годзе мела месца ўсеагульная забастоўка ў Англіі, у 1927 г.—кітайская рэвалюцыя, заражжа такіх яскравых фактаў не наглядаецца. Супроць гэтай аргумэнтацыі выступіў на пленуме тав. Молатаў, які даў падстаўу таму, што м

РЫХТУЕМСЯ ДА АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

Рабочыя чыгуначнікі ў пасеўкампаніі.

Белбюро саюзу чыгуначнікаў дало дырэктывы Вучпрафсожам каб у час асенняй пасяўной кампаніі максимум магі было зьвернута на калектывізацыю вёскі. Падрыхтоўчая праца да правядзеньня пасеўнай кампаніі ўжо пачалася. Так, гомельскія чыгуначнікі арганізуюць майстэрню для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару сяньству падшэфных і вакольных вёсак. Менскі вучпрафсож рыхтуе набыць сельска-гаспадарчы інвэнтар для забясьпечаньня калгасу, які мае быць арганізован у васеньнюю пасеўную кампанію. Група рабочых-чыгуначнікаў з шляху, якія маюць свае гаспадаркі, вырашылі арганізаваць у калгас.

Зараз Белбюро ЦК саюзу чыгуначнікаў па БССР праводзіць агляд прафсаюзнай працы на вёсцы. Асаблівая ўвага зварачаецца на працу сярод чыгуначнікаў, якія жывуць у вёсцы і маюць сваю сельскую гаспадарку.

Усе сілы і ўсе сродкі саюз чыгуначнікаў міркуе кінуць на набыцьцё сельска-гаспадарчага інвэнтару, на арганізацыю калектыўных гаспадарак і іншых вытворчых аб'яднаньняў.

Досьледы вапняка і крэйды.

Інжынэр горнай групы ВСНГ Бел. Р. Розін у гутарцы з нашым супрацоўніком зазначыў, што задачы на вапнаваньню глёбы, якія былі пастаўлены дырэктыўнымі органамі, захапілі БССР яшчэ менш падрыхтаванай, чым іншыя рэспублікі Саюзу.

Вапнякі-ж і залежы крэйды дасьледаваліся настолькі, наколькі яны падобны для прамысловасьці. Скарыстаньне вапнякоў у якасьці ўгнаеньня ў палку дню паўстала толькі сёлета.

4 ліпеня Савнарком БССР даў дырэктывы ВСНГ, каб апошні праз свой апарат аддзел тэрмінова заняўся адшуканьнем месц для пабудовы 63 млыноў па размолу вапняку. Гэтыя млыны павінны быць пабудаваны сёлета.

З 12 ліпеня пачалі працаваць асобныя партыі па досьледах залежаў вапняку. У зьвязку з недахопам працаўнікоў і прыладаў, прышлося ўзяць працаўнікоў з іншых работ, а недахопам новых прыладаў на заводах быў праўлен самастойнай загатоўкай.

Разьведачныя партыі ВСНГ ня сустрэлі на мясцох належнага падтрыманьня, мясцовыя працаўнікі яшчэ недастаткова ўцямілі ўсё значэньне вапнаваньня глебы і лічаць, відаць, справу лішняй выдумкай. Напрыклад, у Касыроковіцкім райёне некаторыя сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы не аказваюць ніякага сапрычаньня групе дасьледчыкаў. Такі-ж фанак у Білыніччах і ў шэрагу іншых месц.

З гэты пэрыяд дасьледвана па розным мясцох БССР 22 пункты, ідуць досьледы ў Менішчыне, Віцебшчыне, Аршаншчыне і Бабруйшчыне. Да 40 млыноў ужо абсталявана і значная частка іх ўжо працуе.

Работы горнай групы сустракаюць шэраг цяжкасьцяў: умовы залежаў вапняку і крэйды часта такія, што нявыгадны для эксплёатацыі. Крэйда у заходняй частцы БССР залягае гнёздамі, якія часам драпежніцкі распрацоўваліся. Ва ўсходняй частцы БССР часта крэйда залягае глыбока пад зямлёй, часам ляжыць ніжэй узроўню вады, або пад ваданосным пластом.

Усё гэта стварае перашкоды ў распрацоўцы, і адпушчаных для эксплёатацыі сродкаў можа не хапіць.

Глеба, патрабуючая вапнаваньня, часта знаходзіцца далёка ад залежаў вапняку і таму неабходна распрацаваць пытаньне аб транспарце.

Мы ўжо ў свой час пісалі аб вялікіх залежах адкідаў Добрускай папяровай фабрыкі. Гэтыя адкіды могуць і павінны быць скарыстаны для вапнаваньня глебы.

З чэрвеня месяца распачаліся работы па абсталяваньню спэцыяльнага млыну і сушыльні, якія будуць скончаны да 1-га верасьня. Чыгуначная ветка ўжо гатова.

На пасяджэньні камітэту па хімізацыі было зазначана, што адкіды Добрускай фабрыкі ў летні час могуць скарыстоўвацца пасьля ўспашкі крэйдавай гары. Можна і трэба наладзіць самую жвавую перавозку гэтай крэйды для забясьпечаньня сялянства ў асеньнюю пасеўную кампанію, але Белсельсаюз не сьпяшаецца забіраць яе.

„Саюзхлеб" да хлебазагатовак падрыхтаваны.

(Гутарка з упаўнаважаным Хлебсаюзу ў БССР тав. Каганам).

Беларуская кантора «Саюзхлеба» пачвае сваю падрыхтоўчую працу хлебазагатовак.

Саюзхлеб у сёлетнім годзе будзе ўці хлебазагатоўку, як сваім апаратам непасрэдна, так і апаратамі нізавых сеткі спажывецкай і сельска-гаспадарчай кааперацыі. Апарат хлебазагатоўцы будзе ўсямерна дапамагаць у хлебазагатоўцы нізавым ячэйкам кааперацыі дзеля лепшага правядзеньня хлебазагатоўкі.

Праца загатоўкі ад сялян, на апарат Саюзхлеба ускладзены абавязкі браць памольны збор з млыноў.

Ня гледзячы на кароткі тэрмін, які адведзены Саюзхлебу дзеля правядзеньня вучоту млыноў і перадачы ім абкладзеньняў аб разьмерах памольнага збору, работа гэта ўжо скончана, і сучасны момант вядзецца разгляд дзельнікаў. Паступленьне памольнага збору ў месяцы чэрвені было задавальняючае. Плян загатовак за гэты месяц выпаўнен з перавышэньнем. Лічная прыёмка помзбору ў тых месцох, дзе няма хлебазагатавіцельных пунктаў „Саюзхлеба" ускладзена на новыя спажывецкія таварыствы. Для гэтага «Саюзхлеб» зрабіў адмысловую ўмову з „Белкапсаюзам".

Праца загатовак хлеба на «Саюзхлеб» ускладзены абавязкі загатоўкі, якое будзе загатаўляцца сваім апаратам і апаратам абедзьвюх кааперацый (спажывецкай і сельска-гаспадарчай).

Саюзхлебам за апошні час у галіне падрыхтоўкі прароблена наступнае:

Укамплектаваны поўнасьцю апарат, які быў прапушчаны праз спэцыяльныя хлебазагатавіцельныя і сенныя курсы, а таксама і тыя працаўнікі, якія вылучаны для працы саюзнымі органамі і іншымі арганізацыямі.

Хлебсаюзам створаны інстытут кантралёраў у ліку 50 асоб, якія былі вылучаны для гэтай работы райкомамі партыі і саюзнымі арганізацыямі. Сярод іх маецца многа вылучэнцаў з рабочых і сялян.

Адрамантаваны старыя хлебныя склады, а таксама заарандаваны іншыя якія патрэбны як дзеля ссыпкі збожжа, так і дзеля скадаў пад сена.

Пабудавана 28 новых складаў дзеля сена і хлеба; усе яны забясьпечаны неабходным інвэнтаром, як вагі, мяшкі і інш.

Нарыхтавана ў дастатковай колькасьці тара дзеля забесьпячэньня сваіх пунктаў і пунктаў кааперацыі.

У сувязі з тым, што вучот усяго хлеба, які загатаўляецца ў БССР, будзе вытворвацца (падлічвацца) на месцы, Хлебсаюз зьвярнуў асаблівую ўвагу на вучотную частку свайго апарату, прымацоўваючы сюды кваліфікаваных работнікаў.

У заключэньні трэба адзначыць, што падрыхтоўка да хлебазагатавіцельнай кампаніі ў нас сёлета праведзена значна лепш і раней, чым у мінулым годзе.

САВЕЦКІЯ ГАСПАДАРКІ ДА ПЕРШАЙ С.-Г. І ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫСТАЎКІ.

Арганізаваныя на развалінах былых абшарніцкіх маёнткаў, без прадукцыйнай жывёлы, без цягавой і часта бяз людзкой рабочай сілы, нярэдка са спаленымі бела-польскімі акупантамі будынкамі—упартай працай рабочых калектываў, пад кіраўніцтвам кампартыі—савгасы бясспрэчна маюць значныя дасягненьні.

Значна ўзрасьлі асноўныя сродкі вытворчасьці—яшчэ шпарчэй ідзе ўперад узрост валавай таварнай прадукцыі.

Становячыся ў бліжэйшы год сплашнымі выхавальнікамі гатунковага насеньня—савгасы ўсё больш пашыраюць плошчу пад кармавыя і тэхнічныя культуры. Асобныя савгасы паказваюць ужо прыклады—17-20 цэнтнэрнай ураджайнасьці і 3000-4000 тысячную ў літрах удойнасьць, што, зразумела, аднак зусім недастаткова.

Узрастае і агравытворчая праца—дасягаючы сваей найбольшай вялічыні вясной у гэты год.

Паляпшаюцца і ўмовы непасрэдных будаўнікоў савгасаў — рабочых;—на 32 проц. узрасла зарплата ледзь з 1926 г.

Сыстэма савецкіх гаспадарак, што цьвёрда стаіць на нагах—зьяўляецца ў шэрагу месц жывым стымулам калектывізацыі.

Аднак яшчэ шэраг савгасаў працуюць дрэнна—маюць у сябе шэраг буйнейшых недахопаў. Сярод іх ёсьць розныя залежачыя і незалежачыя непасрэдна ад савгасу, падлягаючыя цьвёрдай, рашучай безадкладнай ліквідацыі. Пералічым асноўныя з іх. Вязумоўная драбната шэрагу савгасаў Беларусі ствараючыя меншыя мажлівасьці выкарыстаньня пераваг сапраўды буйнай гаспадаркі. Дрэнна ўкамплектаваны савгасы асноўнымі сродкамі вытворчасьці прадукцыйнай жывёлай на 34 проц. ад патрэбнага ліку ў пяцігодку, да і той нізкай якасьці. Нізкая тэхніка ўсіх галін. Слаба мэханізаваны вытворчыя працэсы; у галіновай гаспадарцы шырока ўжываецца стары інвэнтар, разьлічаны на конную цягу. Трактары раскінуты па 1-3 у савгасах. Пры значнай сетцы індустрыяльных с. г. прадпрыёмстваў, ёсьць няпоўная іх загрузка. Выключна напружданым застаецца грашовае становішча. Ёсьць недахват зваротных сродкаў, стваравочы хранічную запазычанасьць, і несваечасовы водпуск сродкаў. Куды варта такое становішча, калі грошы на жылбудаўніцтва ў мінулым годзе адпушчаліся ў жніўні, верасьні ледзь пачаўся водпуск і ў гэтым годзе. Выключна вузкім мейсцам зьяўляюцца кадры—кадры кіраўнікоў, спэцыялістаў, шырокіх мас рабочых. Нізкая кваліфікацыя і цякучасьць кіраўнікоў, нізкая вытворча-тэхнічная кваліфікацыя рабочых—што зьяўляецца фактамі—бясспрэчна робіць гэту праблему адной з актуальнейшых-важнейшых. Гэта цягне за сабой, як вынік, дрэнна арганізаваную працу, нізкую вытворчасьць працы, а ўсьлед за гэтым і высокі сабекошт прадукцыі.

Высокі сярэдні і недапушчальна крымінальны сабекошт у асобных савгасах падкрэсьліваючых поўную безгаспадарчасьць—(Дарашэвічы—50 руб. цэнтн. жыта, 39 авёс; Канстанцінава—авёс 37 р., Лучыцы—12 руб. цэнтн. бульбы.)

Адсуль выцякаюць і зусім выразныя задачы, якія трэба максымальна хутка на самай справе ажыцьцяўляць. Сацыялістычная рэканструкцыя ўсёй сельскай гаспадаркі накладае на савгасы ня толькі новыя задачы, але і новыя максымальныя тэмпы ў іх ажыцьцяўленьні.

Трэба замест нядаўна меўшай месца аброзкі савгасаў,—ня толькі будаваць новыя буйныя савгасы на балоце і не занятых землях, але і ўсямерна ўзбуйняць савгасы Беларусі, найбольш поўна і рацыянальна выкарыстоўваючы ўсю зямельную плошчу. Узмацненьне энэргетычнай ролі і мэханізацыі савгасаў павінна пайсьці праз арганізацыю машына-трактарных станцый і калён, электраматоры, ня толькі абслугоўваючых савгасы, але і рэарганізуючы індывідуальныя бядняцка-сераднякцкія гаспадаркі. Трактарную гаспадарку в 1930 г. трэба рэарганізаваць,—вязумоўна здаволіўшы заяўку на 100 трактараў для старых савгасаў, як мінімальную колькасьць. Далейшая індустрыялізацыя с. г. праз савгасы—гэта ня толькі вялікі размах будаўніцтва—гэта задача і максымальнай загрузкі працуючых. Роля кантрактацыі тут самая значная.

Усе савгасы павінны на справе быць прыкладамі найвышэйшай вытворчасьці ўсіх галін. Гэта патрабуе цэлага комплексу мер. Шпаркага ўзросту прадукцыйнай жывёлы, рашучага палепшаньня кармавой базы ў савгасах (сенажаці сілос, корань-плёды, штучная паша) і ня менш рашучага палепшаньня забясьпечаньня моцнымі кармамі. Уздым ураджайнасьці патрабуе павялічэньня і рацыяналізацыі захоўваньня і скарыстоўваньня гною, штучных угнаеньняў, торфу, люпіну, розных адкідаў, Гатунковае насеньне і палепшаная агратэхніка дадаткова к гэтаму ўстаноўленыя ліміты дазваляюць выканаць як мінімальныя.

Нізкі сабекошт, адна з цэнтральных задач савгасаў—патрабуе высокай прадукцыйнасьці ўсіх галін, высокай вытворчасьці і якасьці працы—максымальна поўнай загрузкі сродкаў вытворчасьці.

Навукова-Дасьлед. Інстытуту (НДІ) імя Леніна трэба разгарнуць беззадкладна працу па абслугоўваньню запатрабаваньняў савгасаў па навуковай арганізацыі працы ў сельскай гаспадарцы. Гэта патрабуе рашучых зьмен у кадрэх, павышэньня іх кваліфікацыі. Савгасы павінны стаць яшчэ больш актыўнымі рэарганізатарамі сельскае гаспадаркі--непасрэдна арганізуючы калгасы, кааперацыйныя аб'яднаньні, поўна выкарыстоўвая агравытворчую мажлівасьць савгасаў,—праводзячы гэтую працу ў цеснай сувязі з мясцовымі органамі.

Толькі разумеючы і рашуча выконвая гэтыя асноўныя задачы можна правільна падрыхтавацца да першай усебеларускай выстаўкі. Часу да выстаўкі засталося менш году, а праца амаль не пачыналася. Выстаўка пры гэткіх тэмпах падрыхтоўкі —пад пагрозай зрыву. Гэта патрабуе ўдвесяцераных тэмпаў падрыхтоўкі,—трэба хутка дагнаць прапушчанае.

На выстаўцы савгасы павінны выразна прадэманстраваць свае посьпехі якіх дасягнулі яны пад кіраўніцтвам кампартыі за часы свайго існаваньня працы. Павінны паказаць перавагі буйнай дзяржаўнай, плянава-рэгуліруемай вытворчасьці над распыленымі сялянскімі гаспадаркамі, чоткa падкрэсьліць шляхі сацыялістычнай перабудовы і ўзбуйненьня іх.

Трэба паказаць ня толькі шляхі па якіх савгасы самі пайдуць уперад, але канкрэтныя мерапрыёмствы і мэтады, праз якія будуць ажыцьцяўляцца яны. Ніводнай савецкай гаспадаркі ў баку ад падрыхтоўкі к выстаўцы, ніводнай асноўнай галіны гаспадаркі не павінны застацца без дэманстрацыі яе дасягненьняў—без вызначэньня шляхоў і мэтадаў іх разьвіцьця—гэта катэгарычнае патрабаваньне ад усіх савгасаў.

Шырокія рабоча-сялянскія масы, спэцыялісты народнай гаспадаркі, павінны добра пазнаёміцца, ведаць становішча і працу савгасаў.

На прыкладах большай таварнасьці прыбытковасьці, больш поўнай і раўнамернай загрузкі рабочай сілы і паніжанаму сабекошту прадукцыі, трэба прадэманстраваць значэньне гаспадарак камбінатаў.

Паказваючы вырабы тэхнічных прадпрыёмстваў (крухмаль, малочныя прадукты, сушаныя прадукты саду і агароду, прадукты льнаводзтва), павінна быць пераконваюча адбіта значэньне тэхнічных прадпрыёмстваў для рэканструкцыі павышэньня вытворчасьці і таварнасьці сялянскіх гаспадарак.

Дэманстрыруючы дасягненьні ўраджайнасьці палявых, садовых і гародных культур, трэба зрабіць „уласнасьцю" усіх савгасаў, калгасаў і бядняцка-сераднякцкіх гаспадарак тыя шляхі і мэтады пры якіх атрыманы дасягненьні. Зрабіць гэтыя дасягненьні прапагандыстымі за калектыўнае земляробства.

Дзяржнасенкультура асабліва поўна павінна паказаць значэньне гатункованага насеньня, на разьвіцьцё кааперацыйнага насеннаводзтва ў сялянскіх гаспадарках. Паказваючы фактычны мінімум жывёлаводнай справы (пароды прадукцыйнай жывёлы, прадукцыйнасьць, умовы іх утрыманьня), трэба з асаблівай паўнатой паказаць дзяржплемкультуру з сьвіньнямі, птушкакральчатымі заводамі, з усімі не станоўчымі і адмоўнымі бакамі,—з усім значэньнем гэтых галін у сельскай гаспадарцы. Павінны быць паказаны лепшыя найбольш „заслужаныя" племянныя вытворнікі.

Нельга не паказаць саду, розных кустарнікаў, агароду ў паасобку і ў іх „трохпавярховай камбінацыі", як сродкаў інтэнсыфікацыі гаспадаркі і вырашэньня пытаньня сьвежых прадуктаў спажываньня ў гарадох і другіх рабочых цэнтраў. Трэба найбольш поўна паказаць і першыя посьпехі працы беларускага гіганту на балоце савгасу імя „Дзесяцігодзьдзя БССР".

Трэба з усёй поўнатой адбіць на выстаўцы ролю савгасаў, як рэарганізатараў індыв'дуальных сялянскіх гаспадарак—паказаўшы канкрэтную рэальную арганізацыйную і агравытворчую дапамогу калгасам і бядняцка-сераднякцкім гаспадаркам—вынікі працы па сацыяльна-эканамічнай і тэхнічнай рэканструкцыі іх і ўздыму вытворчасьці сельскае гаспадаркі.

І, нарэшце, трэба паказаць быт рабочых з усімі яго палепшаньнямі і недахопамі (умовы працы, кватэрнае становішча, вытворчасьць працы, значэньне навуковай арганізацыі працы, падрыхтоўка рабочых кадраў і інш.). Савгасы ўжо атрымалі арыентыровачнае вызначэньне свайго месца на выстаўцы. Трэба яшчэ раз падкрэсьліць, што падрыхтоўка да выстаўкі—гэта задача ўсіх савгасаў, якія будуць і ня будуць прымаць непасрэднага у ёй удзелу. Падрыхтоўка да выстаўкі—гэта ніяк не падрыхтоўка ледзь найлепшых экспанатаў адарваных ад агульнага становішча гаспадаркі.

Гэта ёсьць задача на падрыхтоўку ўсіх гаспадарак на грамадзкі агляд і кантроль—на рашучую падрыхтоўку ўсіх галін гаспадарак і адбор найбольш прыкладнага з усіх дасягненьняў і недахопаў. Астатак часу трэба аддаць на актыўную сыстэматычную штодзённую падрыхтоўку. Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, рабачкомы, вытворчыя нарады, рабкоры, —безадкладна за падрыхтоўку, за распрацоўку канкрэтнага пляну ўдзелу гаспадарак,—за арганізацыю руху падрыхтоўкі на вёсцы. Гэта павінна быць зроблена безадкладна. Задачы падрыхтоўцы да выстаўкі па зусім канкрэтна вызначаемым мерапрыёмствам павінны пранізаць усё сацыялістычнае спаборніцтва савгасаў—дадаткова ўключаючы поўныя абавязкі ў дагавары ўжо ўступіўшых у спаборніцтва. У выніку падрыхтоўкі да выстаўкі мы павінны мець бурны ўздым гаспадарак ўва ўсіх галінах.

У баку актыўнай падрыхтоўкі выстаўкі ня можа застацца ні адзін савгас, ні адна ячэйка КП(б)Б, ні адзі н рабачком, вытворчая нарада і інш' грамадзкія аб'яднаньні. Інспэктуры трэсту трэба праверыць як ідзе падрыхтоўка, пільна сачыць за ходам яе—прымаючы рашучыя крокі да палепшаньня.

Выстаўка павінна зьяўляцца і зьявіцца адным з вялізарнейшых фактараў выкананьня пяцігадовага пляну сацыялістычнай стройкі.

Выстаўка будзе ўнівэрсытэтам для падрыхтоўкі тысяч і дзесяткоў тысяч барцоў за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі.

За ўпартую падрыхтоўчую працу.

Т. Аўчыньнікаў.

КААПЭРАЦЫЮ—ПАД АГОНЬ МАС.

Плачуць капэрацыйныя капейкі.

(Мазыршчына, Капаткевіцкі раён).

Маецца ў нас невялікае спажывецкае т-ва ў вёсцы Лучыцы.

Што невялікае, дык ня ў тым справа, а справа ў тым,што за 10 месяцаў растрачана ў ім 900 р. Адзін загадчык крамы Верамеяў зрабіў добрае вясельле на 150 р. і не хапіла ў касе крамы за 5 месяцаў працы 400 рублёў.

Зьнялі Верамеева, пасадзілі на яго месца Куняўскага і гэты спэц за 5 месяцаў уладзіў 500 р. Вось ужо 6 месяцаў, як вядзецца справа Верамеева, а канцэ ёй ня відаць. Цяпер трэба пачынаць справу Куняўскага, які таксама за 5 месяцаў растраціў 500 рублёў. Для лучыцкага спажывецкага т-ва, якое мае якіх небудзь тры тысячы ўласных сродкаў, растрата ў 900 руб. за 10 м-цаў вельмі балюча адчуваецца.

Пры гэткай працы за 2-3 гады нічога не застанецца ў таварыстве. Сяляне вельмі і вельмі абураны гэткімі учынкамі крамнікаў.

Неабходна, ад каго гэта залежыць, даць штуршок і паскорыць справы аб растраце і сурова пакараць вінаватых, каб заспакоіць абурэньне сялян. Трэба паладзіць паказальны суд у в. Лучыцах, каб сяляне бачылі, што суд за злачынства па галаве ня гладзіць.

Прыежджы.

„Матэматыкі" з Днепрасаюзу.

„Не обманешь—не продашь", (Дарэвалюцыйная прымоўка).

Маленькае і нязначнае Кручанскае Спажыўобчаства зрабіла нядаўна „открытие" ўсесаюзнага значэньня.

Ёсьць яшчэ гэніі ў Днепрасаюзе і водзяцца Калюмбы ў Аршаншчыне. Аказваецца—у кааператыўнай арганізацыі «Днепросоюз» разьвялося шмат матэматыкаў ды й якіх матэматыкаў!

— Паглядзеў-бы гэты эўрапэйскі матэматык на пудадзеяў з „Днепрасаюзу" і пачырванеўшы, адмовіўся-б ад спаборніцтва. А на самай справе нашыя фэномэны вядуць справу на чыстату, ніякага абману.

Проста лоўкасьць рук. Вось падзівуйцеся.

З накладной № 1409 ад 13-VI 1929 г. на імя Кручанскага Спажыўобчаства відаць, што «Днепроўскі Саюз Спажывецкай Кааперацыі Беларусі» шле паміж іншымі з таварамі і батыст.

Вось Вам выразка з накладной.

Наімен. тавару	Колькасьць	Цана р.	Цана к.	Сумма р.	Сумма к.
Батыст	40,50 м.	—	80	324	—

Агульны Ітог накладной разам з другімі таварамі 1270 руб. 22 кап.

Як бачыце, матэматычны фокус зрабіць надта лёгка. Вось мы маем 40-50 мэтраў батысту, адпускаючы яго па 80 кап. за мэтр атрымаем толькі 32 р. 40 к.: Але навошта-ж у нас галовы. Раз, два, тры—і ніякіх 32 р. 40 к. няма. Заместа гэтае сумы аказалася 324 р. 00 к. Бачыце проста і гэніяльна. Скараціўшы (умоўна) графу капейкі, можна гэты апошнія перанесьці ў рублі. Лічбы тыя самыя, а ітог другі.

Пахваліўшы гэных матэматыкаў, трэба вітаць праз друк і Кручанскае Спажыўобчаства гэдакія матэматычныя экспэрымэнты „Днепросаюзаўцаў" (а яны, здаецца, былі і раней) не заўважаліся праўленьнем.

І толькі апошні выпадак папаўшы пад вочы старшыні рэвізкому т. Шэвялёва прымусіў старшыню праўленьня чыстасардэчна сказаць:

„Раз шлюць з цэнтру, дык дзе-ж ты сачыць будзеш, там без абману!

А сачыць, таварыш, трэба.

Трэба паставіць справу так, каб гэдкія „матэматыкі" лічылі што заўгодна, апрача кааператыўных грошай.

Быкоўскі П. В.

У мануфактурных магазынах МЦРК.

МЦРК, які зьяўляецца цэнтральным рухавіком рабочай кааперацыі па забясьпечаньні рабочых і служачых г. Менску востра-дэфіцытнымі мануфактурнымі таварамі, як не стараецца скасаваць існуючыя да гэтага часу чаргі, ніяк не ўдаецца «і ўсё застаецца як было».

З прычыны таго, што гэтае балючае пытаньне нэрвіруе ня толькі праўленьне МЦРК, але і працаўнікоў прылаўку і праца пры гэткіх умовах немагчыма, трэба ўсё гэта прапрацаваць і паставіць на практычныя рэйкі, дзеля таго, каб гандлёвыя прадпрыёмствы і служачыя мелі магчымасьць перабудаваць сваю працу з разьлікам на лепшае абслугоўваньне працоўнай масы ў пэрыяд свайго рабочага тыдню. Ужытыя праўленьнем МЦРК адзіныя заборныя кніжкі для лепшага і нармальнага разьмяркоўваньня дэфіцытных тавараў, зьяўляецца мерапрыёмствам, якое палягчае набываньню тавараў, але ўсё-ж гэта, як мы бачым, не дало тых вынікаў, якія мяркаваліся.

Неабходна замацаваць пайшчыкаў да магазынаў дзеля таго, каб пайшчык будучы прымацаваным да аднаго ня змог бы атрымаць тавар у іншых магазынах. Прычым водпуск тавараў устанавіць толькі па адной кніжцы пайшчыка тры разы ў месяц у любы час. Дзякуючы гэтаму МЦРК здолее плянава разьмяркаваць свой тавар па колькасьці прымацаваных пайшчыкаў.

Я магу прывесьці шэраг выпадкаў, калі пайшчык прыходзіць у магазын, прад'яўляючы прадаўцу тры і больш кніжак для набору вострадэфіцытных тавараў і прадавец ня мае права, дзякуючы існуючаму правілу запытаць у яго адкуль у яго гэткая колькасьць кніжак і адпускае яму тавар.

Калі прыглядзецца да пайшыкаў, якія стаяць у чарзе ў якім небудзь магазыне, то часта можна наглядаць гэткі малюнак, што ў магазыне забірае тавар прыватнік, які гандлюе на Козьма-Дзямьянаўскай вуліцы, па вырабу гатовае вопраткі.

Гэта тлумачыцца тым, што злосныя пайшчыкі перадаюць гандлярам прыватнікам свае заборныя кніжкі, прасьледваючы пры гэтым матар'яльную выгоду. Адносна паёў па маёй думцы трэба было-б таксама ўнесьці якія-небудзь зьмены, напрыклад:

Рабочыя і служачыя, якіх заробак выяўляецца ў разьмеры да (ста) руб., неабходна ўзносы раздрабіць на больш дробныя сумы, для таго, каб ім было пасільна ўнасіць, дзеля таго, што вельмі часта назіраецца, што пайшчыкі прышоўшы што-небудзь купіць, маючы толькі частку грошай для ўзносу устаноўленай раней нормы, а магазын ня мае права атрымаць менш паказанага.

Таксама неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на далікатнае абыходжаньне таргоўцаў, так як неаднакроць прыкмячаецца вельмі недалікатныя адносіны да пайшчыкаў.

Мы павінны раз на заўсёды памятаць, што ў нас павінен быць гандаль культурны і гэта мы павінны патрабаваць ад нашых прадаўцоў, гэтага патрабуе культурна-выхаваўчая праца.

В. Райхштэйн.

Н. БЯЛІНА-ПАДГАЕЦКІ.

ЖЫЦЬЦЁ ЗАКЛІКАЕ*)

III.

Густаў, падабраны на поле бойкі цамі санітарамі ачуняў пасьля доўгага часу ўжо ў глыбокім тылу, у палоне нямецкім шпіталі.

—Дзе я, што са мною?--са зьдзіўленьнем думаў ён, аглядаючы напоўнены раненымі і ўміраючымі барак.

—Камарад, зьлітуйся!--кідаўся ў моцным гарачцы яго сусед па пасьцелі.--У мяне жонка, дзеці! Маленькі, прыгожы хлопчык!

—Што гэта? Я недзе чуў ужо гэты голас?—зьдзіўлена падняўся на локці Густаў.—Ах, праўда! так прасіў мяне немец, у якога я разьвярнуў штыком жывот там, у акопах!

Ён хацеў павярнуцца на другі бок, каб лепш разглядзець свайго суседа, але вострая боль у назе і ў ляжцы змусіла яго зноў са стогнам паваліцца на падушкі.

Паранен у нагу, мільганула неспакойная думка, і мабыць у палоне ў немцаў!

Гэтая радасьць гарачай хваляй абпіла ўсю істоту маладога Густава:

— Жывы, жывы!—сьпявала ў яго грудзях. Я ўсё такі жывы і мне доўга прыдзецца больш хадзіць у атаках, нарвуць і мокнуць у сырых акопах!

* * *

Разгаварыліся. Сусед па пасьцелі—стары якога Густаў пырнуў у жывот штыком у тую памятную для абодвых атакі пад Вэрдэнам, які быў сьлесарам аднаго з дартмундзкіх заводаў. Гэты задоўга да вайны ён прапрацаваў на ўстаноўцы турбін з паўгода ў Парыжы з гарадоў поўначы Францыі, ведаў досыць добра францускую мову і вельмі любіў гаварыць на ёй.

Ён апавядаў Густава аб цяжкіх умовах працы на дармундзкай фабрыцы, аб эксплёатацыі там рабочых, аб штрафах і пакараньнях, якім яны там за найменшую віну падпадалі. Ён расказаў Густаву пра сваю сям'ю, якую ён пакінуў там, у Дартмундзе, аб сваёй маладой яшчэ жонцы, аб сваіх двух белявых дзетках.

— Церпяць патрэбу яны там бедныя без мяне,—цяжка ўздыхаючы гаварыў ён.—Вядомая справа, цяжка жыць без кармільца!

— Так, і я сьлесар—вось дык штука!—зьдзіўлена сказаў Густаў. І ў нас на фабрыцы тое-ж самое: эксплёатацыя, штрафы, пакараньні...

І крыху падумаўшы, ён нерашуча спытаў:

— Значыцца мы абодвы з табой рабочыя дружа Фрыц.

За што-ж я цябе пырнуў штыком, пытаньне? Чаму ты пайшоў вайной супроць нас, французаў?

— Мабілізацыя, ціха адказаў яму на сьмерць паранены нямецкі салдат. Мы—рабочыя не хацелі вайны. Яе задумалі капіталісты.

— Капіталісты!.. працягла прамовіў малады Густаў. Я ўжо недзе чуў пра гэта.

І крыху падумаўшы, ён кажа далей:

— Ах праўда, пра гэта-ж казаў нам салдат другога ўзводу Поль Жырандэль забіты там, у акопах выбухам саракадвохсантымэтравага снаряду.

У гэты вечар Густаў больш не гаварыў з сваім суседам па пасьцелі палявога нямецкага шпіталю.

Яму было прыкра глядзець у вочы свайму таварышу па клясе, кожны стогн ягога цяжка адзываўся ў яго на сэрцы.

* * *

А калі зноў прышла ноч—стала яшчэ горш цяжка параненаму нямецкаму салдату Фрыцу Вэбэру.

— Вады, вады! крычаў ён зрываючы павязкі з сваіх ран. У мяне агонь у сярэдзіне!.. Ох, хоць-бы сьмерць хутчэй прышла!..

І ён кідаўся па пасьцелі, грыз ад болю зубамі коўдру, у бруду то праклінаючы, то молячы кагосьці.

Над самым раньнем паранены Фрыц зноў на момант ачуняў.

— Вады, прахрыпеў умираючы.

І ён заціх у апошняй перадсьмяротнай сударэе, сваёй кастлявай доўгай рукой захапіўшы ў ліхаманкавым сьціску спушчаную ўздоўж коўдры руку маладога Густава.

— Даруй таварыш, даруй! са сьлязьмі на вачох шаптаў паранены французкі салдат. Я не хацеў гэтага!

... Наступнаю раніцою Густаву Мароўю адрэзалі да калена левую ногу.

IУ.

На пыльнай шашы, якая вядзе да таго месца, дзе ўсяго чатыры гады таму назад узвышаўся вялікі гандлёвы горад Туркуэн і на месцы якога зараз стаялі толькі абвугленыя і ачарнеўшыя ад дыму руіны—па пыльнай шашы ў гэты палкі ліпнёўскі поўдзень ішоў чалавек.

— Ах ліха, як раскрамсалі горад, прамовіў ён скрозь зубы. Камня на камні не засталося, нават ландшафт мясцовасьці зьмяніўся ад гарматных прабоін. Не пазнаю зусім гораду, хоць я ў ім і нарадзіўся, і вырас.

Чалавек скруціў папіроску, і запаліў пільна прыслухоўваючыся па бакох

Нікога няма, казаў ён пасьля некаторых хвілін маўчаньня.

Няўжо-ж я адзін у гэтых руінах? Трэба будзе перашукаць добра ўсе дамы.

Нарэшце, пасьля доўгіх бясплодных пошукаў яму ўдалося спаткаць сярод руін старую, у трапты апранутую жанчыну, якая са стогнам сабірала кавалкі гарэлага дрэва, рэштку разьбітых лавак і дошак.

Але-ж гэта Мар'я, матка забітага пад Вэрдэнам каваля Жэмона, падумаў чалавек і шпаркім крокам, на колькі яму дазваліла мыліца, якая замяніла страчаную на фронце нагу, ён накіраваўся на сустрэч старой.

Эй, Мар'я, цётка Мар'я!—гукнуў ён, махаючы шапкай. Гэта—я, Густаў Мозэль, не лякайцеся. Густаў Мозэль, сын Андрыяна Мозэля, які жыхарствараў на вуліцы чатырох братоў проці кузьні майго беднага Грэгуара?—Закрычала старая жанчына, кідаючы на зямлю сабраўныя кавалкі дошак і зьдзіўлена ляснула рукамі. Ці магчыма гэта?—цябе лічылі ў сьпісах забітых пад Вэрдэнам...

— Вось як, зарагатаў Густаў, значыцца мяне тут жывым пахавалі. Не, цётка Мар'я, я быў толькі вельмі сур'ёзна паранены пад Вэрдэнам і трапіў у палон, адкуль зараз і эвакуяваны на бацькаўшчыну.

— І памаўчаўшы крыху, ён ціха спытаў:

— Скажэце, цётка Мар'я, вы ня ведаеце дзе зараз знаходзіцца мае бацькі? Яны павінна-быць эвакуіраваліся ў глыбіню краіны?

— Не, гаротны Густаў, гэта ня так, смутна адказала яму старая жанчына. Твой бацька і маці абодвы згінулі над руінамі свайго дому яшчэ пры першай бамбардыроўцы гораду.

— Бедны бацька, бедная маці, з нудой прашаптаў Густаў, бяссільна апускаючыся на адзін з камнёў. Мне так хацелася іх бачыць.

— А скажэце, цётка Мар'я, нерашуча спытаў Густаў Мозэль, вы ня ведаеце дзе знаходзіцца зараз мая Паліна—Паліна Грэнье, з якой я зрабіў заручыны перад самай вайной?

— Паліна Грэнье, перапытала яго старая. Гэта такая прыгожая блёндынка, дачка гаспажы Грэнье, якая трымала маленькае бістро *) ля самай крамы фабрыкі?

— Вось, вось... яна самая і ёсьць.

— О, яна ня блага жыве ў Парыжы, засьмяялася старая. У аксаміт апранута, пудрыцца, валасы астрыгла па апошняй модзе.

— Што-ж яна там робіць? З заміраньнем у сэрцы спытаў старую Густаў Мозэль. Працуе?

— Дзе там працуе! са сьмехам адказала яна яму. Гуляе, як і большасьць нашых маладых дзяўчат, выкінутых вайною на тратуары Парыжу...

* * *

У тавэрні „Пантэон", што ля Сарбоны было шумна і весела.

Лёкаі ў палінялых смокінгах і ў белых фартухох з вялікімі падносамі поўнымі шклянак, бутэляк і кружак, лоўка сьлізгалі, прабіраючыся сярод гэтага, кіпучага вясельлем натоўпу, прыймаючы заказы ад адных, даючы рэшту другім, нарыхтоўваючы спэцыяльныя напітк

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА ЭКАНАМІЧНАЕ НАРАДЫ ПРЫ СНК БССР

пра арганізацыю будаўніцтва па ўсіх галінах народнае гаспадаркі на бліжэйшае пяціг одзьдзе.

У мэтах забясьпечаньня належнай падрыхтоўкі да будаўніцтва бліжэйшага пяцігодзьдзя, выкананьня намечаных на пяцігодзьдзе плянаў і бесперабойнага ходу будаўніцтва, а таксама ўпраўкаваньня і патаненьня будаўніцтва—Эканамічная Нарада пастанаўляе:

I. Па забясьпечаньню будаўніцтва кваліфікаванай рабочай сілай.

1. Агульнае кіраваньне, плянаваньне і кантроль па ўсіх відах і формах рынку працы ўскласьці на Народны Камісарыят Працы.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы пасіліць нагляд за выкананьнем будаўнічымі арганізацыямі законаў і правілаў па найму рабочай сілы і зрабіць рашучыя захады да недапушчаньня ажыятажу на рынку працы.

2. З тае прычыны, што ўжо на першы год пяцігодкі ёсьць недахоп рабочых па некаторых кваліфікацыях, запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы а ўдзелам Народнага Камісарыяту Працы, Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі і іншым зацікаўленым установам своечасова арганізаваць падрыхтоўку недастаткова кваліфікаванай сілы, прычым арганізацыя самой падрыхтоўкі павінна быць пастаўлена такім чынам, каб падрыхтоўваемая рабочая сіла магла быць скарыстана ў даным будаўнічым сэзоне.

Праграма курсаў павінна адпавядаць запатрабаваньням будаўніцтва з улікам новых прыёмаў яго вытворчасьці.

Аб выніках ходу падрыхтоўкі кваліфікаваных будаўнікоў Народны Камісарыят Асьветы і Народны Камісарыят Працы абавязаны штогодна не пазьней 15 красавіка паведамляць камітэту па будаўніцтву.

3. З прычыны таго, што паказаны плян падрыхтоўкі не ізжыцьве недахопы рабочай сілы па некаторых прафсіях,—запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы зрабіць захады да вучоту наяўнасьці кваліфікаваных будаўнікоў у сельскіх мясцовасьцях для скарыстаньня іх у плянавым парадку для будаўніцтва, пашырыўшы сетку карэспандэнцкіх пунктаў у мясцох адходу і наяўнасьці будаўнікоў, забясьпечыўшы існаваньне гэтых пунктаў у працягу цэлага году.

Адначасова з гэтым правесьці не пазьней 1-1-1930 году мерапрыемствы на спрашэньню сыстэмы вучоту і рэгістрацыі рабочых будаўнікоў.

4. Запрапанаваць будуючым арганізацыям і ўстановам рабіць своечасова захады да поўнага скарыстаньня будаўнічага сэзону, а таксама перанасіць на зімні пэрыяд тыя работы, тэхнічнае правядзеньне якіх магчыма ў зімні час (прыгатаўленьне крокваў, нарыхтоўка матар'ялаў для падлогі, работа па цэнтральнаму апалу, вязка рам, дзьвярэй і г. д.).

Рамонтныя, а таксама ўнутраныя работы павінны быць выконваемы ў першай палове будаўнічага сэзону.

5. Запрапанаваць Камітэту па Будаўніцтву не пазьней 15-X—1929 году распрацаваць мерапрыемствы па падвышэньню прадукцыйнасьці працы.

6. Маючы на ўвазе нізкую кваліфікацыю будаўнічых рабочых, лічыць неабходным арганізаваць перападрыхтоўку будаўнікоў па падвышэньню іх кваліфікацыі, для чаго запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы і будаўнічым арганізацыям, па ўзгадненьню з саюзам будаўнікоў, арганізаваць перападрыхтоўку будаўнічых рабочых, выходзячы з наступнага разьліку:

У 1929-30 годзе павінна быць перападрыхтавана ня менш 10 проц. усіх кваліфікаваных рабочых.

У 1930-31 годзе павінна быць падрыхтавана ня менш 15 проц. кваліфікаваных рабочых.

У 1931-32 годзе павінна быць падрыхтавана ня менш 20 проц. кваліфікаваных рабочых.

У 1932-33 годзе павінна быць падрыхтавана ня менш 25 проц. кваліфікаваных рабочых.

7. Дзеля ўхіленьня плыўкасьці складу рабочых—абавязаць будуючыя і будаўнічыя арганізацыі шырэй практыкаваць замацаваньне за сабой сталых кадраў кваліфікаваных рабочых.

II. Па забясьпечаньні будаўніцтва тэхнічным пэрсаналам.

1. Для памяншэньня недахопу ў вышэйшым тэхнічным пэрсанале—пасіліць ужываньне будаўнічымі арганізацыямі сыстэмы кантрактацыі студэнтаў старшых курсаў ВТУЗ для працы ў БССР. Прапанаваць будаўнічым і будуючым арганізацыям, у мэтах забясьпечаньня вышэйшым тэхнічным пэрсаналам, устанавіць спэцыяльныя стыпэндыі для вучнаў вышэйшых будаўнічых вучэбных устаноў.

2. Для павялічэньня колькасьці сярэдня-тэхнічных кадраў—паступова пашырыць прыём вучняў у Менскі політэхнікум па архітэктурнаму аддзяленьню, пачынаючы з 1929-30 году.

Прапанаваць будаўнічым арганізацыям, пасьля скарыстаньня мясцовых сіл, запрашаць неабходную ім колькасьць тэхнікаў з іншых рэспублік і скарыстоўваць практыкантаў з ВТУЗ'аў.

У мэтах падрыхтоўкі кваліфікаваных тэхнікаў для прамысловага будаўніцтва выдзяліць з старшых курсаў Менскага політэхнікуму групу вучняў з ухілам у кірунку прамысловага будаўніцтва і адпаведныя гэтай задачы зьмены ўнесьці ў праграму і вучэбныя пляны політэхнікуму.

3. Арыентыровачна прыняць плян падрыхтоўкі дзесятнікаў у наступным відзе: а) адчыніць з 1929-30 году стальныя школы з 2-х гадовым курсам у Менску і Віцебску, б) менскія кароткатэрміновыя курсы (4-х месячныя) заставіць яшчэ на 2 гады (1929-1930 і 1930-1931 г. г.) і в) арганізаваць у Віцебску кароткатэрміновыя курсы на 1929-30 год. Кароткатэрміновыя-ж курсы (4-х месячныя), якія дзейнічалі ў 1928-29 годзе ў Полацку, Воршы і Мазыры, зачыніць з пачатку 1929-30 году.

Лічыць неабходным, нараду з падрыхтоўкай новых кадраў, дакваліфікаваць працуючых цяпер на будаўніцтве дзесятнікаў з ліку практыкантаў-вылучэнцаў, якія ня маюць належнай тэарэтычнай падрыхтоўкі. Для гэтай мэты прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы арганізаваць у Менску і Гомелі спэцыяльныя кароткатэрміновыя курсы (7-мі месячныя) на 2 гады (1929-30 і 1930-31).

III Па будаўнічым матар'ялам.

1. Плян разгортваньня прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў лічыць плянам мінімальным.

2. З мэтай рэальнага выкананьня пляну разгортваньня прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў прапанаваць:

а) Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі да 1 жніўня 1929 году скончыць трэстыраваньне цагляной, вапнянай і іншай прамысловасьці;

б) Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі і акруговым выканаўчым камітэтам давесьці магутнасьць заводаў да найбольшай нагрузкі, шляхам рэканструкцыі заводаў з пераходам на машынную фармоўку, пракладкай рэйкавых шляхаў, пабудовай дадатковых пячэй і сушыльных памяшканьняў і г. д., прадугледзіўшы зьмены ў прамфінпляне;

в) Белсамрамсаюзу, Белсельсаюзу (па таварыствах агнятрывалага будаўніцтва), сялянскім камітэтам узаемадапамогі і іншым арганізацыям, якія вядуць саматужную вытворчасьць, давесьці вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў на іх прадпрыемствах да найбольшых разьмераў.

2. Прапанаваць ВСНГ пасіліць пры дапамозе Беларускае Акадэміі Навук далейшае вышуканьне месцараджэньня будаўнічых матар'ялаў з мэтай пашырэньня рэспубліканскай і мясцовай прэмысловасьці будаўнічых матар'ялаў.

3. З прычыны наяўнасьці дэфіцыту ў дахавым жалезе—прапанаваць Белсамрамсаюзу і Н. К. Земляробства пасіліць працу па выработцы чарапіцы, зьвярнуўшы увагу на выпрацоўку цэглянай чарапіцы.

4. У мэтах забясьпечаньня будаўніцтва сухой драўнінай—абавязаць ВСНГ і будаўнічыя арганізацыі, самастойна загатаўляючыя лясныя матар'ялы, прыняць рашучыя захады арганізацыйнага і фінансавага парадку да пабудовы сушылак і ўтварэньня запасаў сухіх лесаматар'ялаў у разьмерах, адпаведных намечанаму на бліжэйшыя гады тэмпу будаўніцтва, у адпаведнасьці з пастановай Эканамічнай Нарады БССР пра мерапрыемствы па барацьбе з дамовым грыбком (З. З. БССР за 1928 год, № 3, артыкул 18).

5. Прапанаваць усім будуючым арганізацыям строга выконваць усе распараджэньні, якія выдаюцца аб нормах і парадку выдаткаваньня будаўнічых матар'ялаў.

Прапанаваць усім будуючым і будаўнічым арганізацыям праводзіць узмоцненую эканомію ў выдаткаваньні дэфіцытных прывозных матар'ялаў, як у напрамку дапушчальнага адказу ад канструкцыі з гэтых матар'ялаў, гэтак і ў напрамку паменшаньня выдатку матар'ялаў там, дзе нельга адмовіцца ад іх спажываньня, шляхам прымяненьня эканомных норм разьліку, эканомнага праэктаваньня, папярэджаньня лішкавых страт і адходаў.

6. Прапанаваць ВСНГ распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па палепшаньні якасьці вытворчасьці будаўнічых матар'ялаў і аб прынятых захадах паведаміць Эканамічную Нараду не пазьней 1-I—1930 году.

7. Прапанаваць Н. К. Гандлю своечасова выпрацоўваць цэны на будаўнічыя матар'ялы з такім разьлікам, каб для чарговага будаўнічага сэзону цэны апублікоўваліся да 15-XI.

8. Абавязаць ведамствы і ўстановы штогодна, не пазьней 20-VIII, прадстаўляць у НК Гандлю заяўкі на патрэбныя для будаўніцтва надыходзячага году матар'ялы, згодна норм устаноўленых камітэтам па будаўніцтву.

9. Даручыць НК Гандлю разам з камітэтам па будаўніцтву выконваць праверку заяў і ўстанаўляць штогодна разьмер агульнага запатрабаваньня ў будаўнічых матар'ялах, прычым у агульным балянсе матар'ялаў прадугледзіць вызначаны фонд для індывідуальнага жыльлёвага будаўніцтва. Тэрмін складаньня бляснуу будаўнічага матар'ялу ўстанавіць—1 студзеня.

10. Снабжэньне рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці (як правіла) усімі будаўнічымі матар'ялямі згрупаваць у Белпайгандлю, за выключэньнем часткі матар'ялаў, завозімых транзітам па непасрэдным праз сындыкаты заказам.

11. Абслугоўваньне шырокага рынку ўскласьці на Белпайгандаль. Дапусьціць жыльлёвую і спажывецкую каапэрацыю да снабжэньня індывідуальнага будаўніцтва матар'ялямі; снабжэньне-жа шырокага рынку праз жыльлёвую каапэрацыю дапусьціць толькі ў тых пунктах, дзе адсутнічае гандлёвы апарат Белпайгандлю.

12. Прапанаваць Белпайгандлю пашырыць сваю гандлёвую сетку і арганізаваць у акругах гуртова раздробныя магазыны.

13. Прапанаваць акрвыканкомам, па меры арганізацыі гурткова-раздробных магазынаў Белпайгандлю — ліквідаваць гандаль камунальных трэстаў будаўнічымі матар'ялямі, з перадачай Белпайгандлю гандлёвых лішкаў, заключаных дагаварою на пастаўку матар'ялаў і адчыненых банкаўскіх крэдытаў.

14. У выкананьне пастановы СПА ад 21-XII—28 г. прапанаваць АВК абавязаць камунальныя трэсты і іншыя прадпрыемства па мясцовай прамысловасьці здаваць прадукцыю цэглы і вапны Белпайгандлю, за выключэньнем часткі, вызначанай дзеля задавальненьня патраб акругі.

IV. Па арганізацыі транспарту.

1. У мэтах палепшаньня і патаненьня аўта-гужавога транспарту будаўнічых матар'ялаў як мясцовых, гэтак і прывозных, даручыць Камітэту па Будаўніцтву і Белдортрансу, з удзелам зацікаўленых ведамств і арганізацый, распрацаваць мерапрыемствы на бліжэйшае пяцігодзьдзе па рэгуляваньню і палепшаньню транспарту будаўнічых матар'ялаў, прадугледзіўшы магчымасьць утварэньня для гэтай мэты адзінай дзяржаўнай транспартнай арганізацыі, маючы на ўвазе пасіленьне аўтатранспарту за лік гужавога.

2. Прапанаваць Белдортрансу разам з зацікаўленымі ведамствамі і арганізацыямі, пры ажыцьцяўленьні пляну дарожнага будаўніцтва ўлічыць неабходнасьць таксама палепшаньня тых шляхоў, на якім будзе вытварацца перавозка будаўнічых матар'ялаў да буйных аб'ектаў будаўніцтва прадугледжаных пяцігодзьдзем.

3. Даручыць Белдортрансу і будаўнічым арганізацыям удакладніць аб'ём перавозак будаўнічых матар'ялаў на бліжэйшую пяцігодку і вызначыць плян іх перавозкі ў акруговым разрэзе.

4. Лічыць неабходным памяншэньне прамысловага падатку для асоб, якія займаюцца транспартам будаўнічых матар'ялаў і даручыць НКФ распрацаваць адпаведны праэкт і ўнесьці яго на разгляд СНК не пазьней 15-IX—29 г.

V. Па арганізацыі праэктаваньня.

1. У мэтах рацыяналізацыі справы праэктаваньня лічыць неабходным:

а) для праэктаваньня прамысловага будаўніцтва ўзмацніць і пашырыць Праэктнае Бюро пры ВСНГ;

б) для праэктаваньня будаўніцтва жыльлёвага і ведамсьцьвеннага (школьнага, бальнічнага і г. д.) арганізаваць пры Белжылсаюзе Жыльлёвае Праэктнае Бюро з пачатку новага гаспадарчага году;

в) для праэктаваньня сельска-гаспадарчага будаўніцтва ўтварыць Спэцыяльнае Праэктнае Бюро пры НК Земляробства.

Даручыць Камітэту па Будаўніцтву, з удзелам гэтых арганізацый, распрацаваць пытаньне аб разьмеркаваньні паміж імі працы па праэктаваньні, удакладніўшы кампэтэнцыю кожнай з іх.

2. Прапанаваць кіраўнікам паказаных Праэктных Бюро прыняць меры да прыцягненьня інжынэраў-праэктыроўшчыкаў з высокай кваліфікацыяй і дастатковым практычным стажам.

3. У мэтах узаемнага абмену вопытам усе паказаныя Праэктныя Бюро павінны падтрымліваць між сабою цесную сувязь.

4. Праэктаваньне па асобна-складаным пабудовам і па спэцыяльным работам, якія выконваюцца існуючымі агульнасаюзнымі арганізацыямі (Хімбуд, І'прамэз, Шклобуд, Хладаэкспарт і інш.) павінна перадавацца адпаведным арганізацыям ці астатнія павінны прыцягвацца да экспэртызы. Незалежна ад гэтага, для палепшаньня праэктаваньня, належыць карыстацца адпаведнай саюзнай і замежнай кваліфікаванай тэхнічнай дапамогай і экспэртызай.

5. Незалежна ад пералічаных у п. I праэктных арганізацый у асобных будаўнічых арганізацыях могуць існаваць праэктныя ячэйкі для складаньня рабочых чарцяжоў і іншых работ па праэктаваньню, зьвязаных непасрэдна з вытварэньнем будаўнічых работ.

6. У мэтах спрашчэньня праэктаваньня і прысьпешаньня праэктных работ—прапанаваць усім Праэктным Бюро і паасобным ведамствам і ўстановам:

а) распрацаваць тыпавыя праэкты для аднастайных пабудоў з тыпізацыяй паасобных будынкаў і пабудоў;

б) па меры пацьверджаньня тыпавых праэктаў пэрыядычна выдаваць зборнікі іх і

в) ужываць сыстэму паўторнага выкарыстаньня праэктаў і рабочых чарцяжоў.

Даручыць Камітэту па Будаўніцтву да 1 лістапада выдаць інструкцыю аб парадку згрупаваньня праэктаў па выкананаму будаўніцтву і далейшага іх выкарыстаньня.

7. У мэтах забясьпечаньня будаўніцтва сродкамі на вышукальныя працы, праэктаваньне і экспэртызу—абавязаць установы і ведамствы ўключаць у кантрольныя лічбы і праводзіць у сваіх гадовых каштарысах адпаведныя сумы, прычым па буйнейшым аб'ектам будаўніцтва асыгнаваньні прадугледжваць пятытульна.

8. Да вытварэньня неабходных падрыхтоўчых работ арганізацыйнага характару, зьвязаных з праэктаваньнем, установы і ведамствы абавязаны прыступаць неадкладна пасьля складаньня гадовых плянаў капітальнага будаўніцтва.

3. У залежнасьці ад вынікаў праэктаваньня—установы і ведамствы павінны строга пільнавацца наступных запатрабаваньняў:

а) заказ абсталяваньня павінен рабіцца не раней зацьверджаньня экскізнага праэкту вызначанага будаўніцтва;

б) прыступ да вытварэньня будаўнічых работ дапушчаецца выключна пры ўмове наліччя канчаткова зацьверджанага і ўзгодненага ў належных органах праэкту.

VI. У адносінах будаўнічых арганізацый.

1. Выходзячы з разьмераў намечанага пяцігадовым плянам будаўніцтва, лічыць існуючую ў БССР сетку будаўнічых кантор—Белдзяржбуд, Белжылсаюз і Гандальбуд—дастатковай для выкананьня гадавога будаўніцтва падрадным спосабам, з арганізацыяй гэтымі канторамі (акрамя—Гандльбуду) сваіх філіялаў у тых акругах, дзе гэткіх ня маецца ў даны час.

2. Абавязаць будаўнічыя арганізацыі ўтварыць у сябе спэцыяльныя рамонтныя аддзелы для абавязковага прыёму да выкананьня ўсіх капітальна-рамонтных работ.

3 Да вытварэньня складаных і буйных спэцыяльных работ (напрыклад, каналізацыя, ваданасьнабжэньне, пабудова халадзільнікаў і г. д.) могуць быць прыцягнуты існуючыя агульнасаюзныя будаўнічыя канторы.

4. Маючы на ўвазе, што штогодна ўзрастаючы аб'ём сялянскага будаўніцтва, у асаблівасьці—калгаснага і савгаснага, патрабуе выкананьня работ падрадным спосабам, утварыць пры НК Земляробства Бюро сялянскага будаўніцтва для вытварэньня падрадным спосабам буйных аб'ектаў будаўніцтва па індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Даручыць НК Земляробства разам з Камітэтам па будаўніцтву распрацаваць грунтоўныя палажэньні арганізуемай установы і праз Дзяржплян падаць у Эканамічную Нараду.

5. Канстатуючы вялікую недастарчальнасьць уласных сродкаў будаўнічых арганізацый, даручыць Дзяржплану і НК Фінансаў распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы ў адпаведнасьці з дырэктывамі СПА па правядзеньню асноўных і зваротных сродкаў будаўнічых арганізацый у адпаведнасьці з іх вытворчай праграмай.

6. Размеркаваньне будаўнічых работ паміж паасобнымі будаўнічымі арганізацыямі ўскласьці на Камітэт па будаўніцтву.

VII. Па фінансаваньню будаўніцтва.

У мэтах упарадкаваньня фінансаваньня будаўніцтва—прызнаць неабходным, каб на падставе агульнага аб'ёму будаўніцтва, вызначанага пяцігадовым плянам народнае гаспадаркі і гадовымі плянамі, вытвараліся паквартальныя разьмеркаваньні сродкаў, накіраваных на будаўніцтва з усіх крыніц. Працу гэту павінны выконваць па заяўках будаўнічых і будуючых арганізацый НК Фінансаў і Дзяржплян не пазьней сьнежня, а памяняныя арганізацыі свае заяўкі павінны ўносіць у Дзяржплян не пазьней 1 лістапада 1929 году.

VIII. Па пасіленьню будаўнічага кантролю.

Прымаючы пад увагу невыстарчальнасьці кантролю за будаўніцтвам на мясцох, ажыцьцяўляемага акруговымі інжынэрамі, якія ня маюць штатаў і загружаны цяпер функцыямі, якія не адносяцца да тэхнічнага кантролю і рэгуляваньню будаўніцтва, пасіліць кантроль за будаўніцтвам на мясцох.

Даручыць НК РСІ ўстанавіць неабходныя штаты ў адпаведнасьці з аб'ёмам будаўніцтва і функцыямі органаў будаўнічага кантролю.

IX. Па рацыяналізацыі і мэханізацыі будаўніцтва.

1. Прапанаваць Камітэту па Будаўніцтву пахутчыць распрацоўку канкрэтных мерапрыемстваў на пяцігодзьдзе па рацыяналізацыі будаўніцтва, з такім разьлікам, каб да 1 студзеня 1920 году былі выданы адпаведныя пастановы па найбольш значным пытаньням.

2. Даручыць Камітэту па будаўніцтву з удзелам будаўнічых арганізацый устанавіць парадак узаемнага абмену будаўнічымі арганізацыямі свайі дасягненьнямі ў галіне будаўніцтва, асабліва ў адносіне мерапрыемстваў па рацыяналізацыі і патаненьню будаўніцтва.

X. Па стандартызацыі і вопытна-паказальнаму будаўніцтву.

1. Лічучы неабходным наладзіць вопытна-паказальнае будаўніцтва, тыпізацыю і стандартызацыю будаўніцтва, згрупаваць распрацоўку ўсіх гэтых пытаньняў у Камітэце па Будаўніцтву, прадаставіўшы астатняму права прыцягваць да разгляду гэтых пытаньняў навукова-дасьледчыя арганізацыі і экспэртаў-спэцыялістых.

2. Прапанаваць Камітэту па будаўніцтву распрацаваць плян і праграму работ на бліжэйшае пяцігодзьдзе па стандартызацыі і вопытна-паказальнаму будаўніцтву.

3. Прапанаваць усім установам і арганізацыям, не абмяжоўваючыся прымяненьнем агульна-саюзных стандартаў разгарнуць самастойную працу па выпрацоўцы ведамсьцьвенных стандартаў, у прыватнасьці стандартаў паміж паверхавых перакрыцьцяў, даху, перагародак, лесоў і г. д., абавязаўшы іх аб сваёй рабоце і аб прапрацаваных імі тыпах стандартаў і вопытнага будаўніцтва паведамляць у Камітэт па Будаўніцтву дзеля агульнага ўзгадненьня і выкарыстаньня пры апублікаваньні агульнарэспубліканскіх тыпаў.

4. Прапанаваць усім будуючым арганізацыям своечасова даваць заказы на ўсе тыя часткі і элемэнты будынкаў масавага вытварэньня, якія выробляюцца альбо могуць быць выраблены ў майстэрнях ці заводзкіх прадпрыемствах, у прыватнасьці, цалкам выкарыстаць прадукцыю Бабруйскага заводу дэталей.

5. Прапанаваць усім будуючым арганізацыям рабочыя чарцяжы праэктаў увязваць з існуючымі стандартамі лясных матар'ялаў, жалезных балек, шкла, вакон, дзьвярэй і інш.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканомнарады БССР В. Крыніцкі.

2 жніўня 1929 г., г. Менск.

ХРОНІКА.

Усебеларускі зьлёт піанэраў.

Учора на летняй пляцоўцы „Профінтэрн" адбываўся працяг спаборніцтваў па фізкультуры сярод удзельнікаў зьлёту.

* * *

Дзелавая праца піанэрканфэрэнцыі 12 жніўня скончылася вялікім вечарам самадзейнасьці ўдзельнікаў зьлёту. Былі праведзены шэраг цікавых выступленьняў выключна сіламі дзяцей.

* * *

Учора і сёньня дэлегаты зьлёту асобнымі групамі выяжджаюць на фабрыкі, заводы і чырвонаармейскія лягеры, дзе будуць праведзены лятучыя мітынгі.

Да XV Міжнароднага Юнацкага Дню.

Камсамольскія арганізацыі пачалі падрыхтоўчую працу да правядзеньня XV МЮД.

У гэты час у Менску будуць праведзены агульна-раённыя сходы камсамольцаў разам з беспартыйнай моладзьдзю.

Камсамольскія ячэйкі наладжваюць выезды ў падшэфныя вёскі і чырвонаармейскія часткі.

У час сьвята па ячэйках будзе праведзена масавая вярбоўка рабочай моладзі ў камсамол.

Фізкультура і спорт.

Масавы вечар.

Культаддзел ЦСПСБ у нядзелю 18-га жніўня наладжвае ў садзе „Прафінтэрн" масавае гуляньне, прысьвечанае Першай Усебеларускай Спартакіадзе сялянскіх фізкультурнікаў.

У часе гуляньня будуць наладжаны сустрэчы па баскет-болу паміж камандамі Менску, Віцебску, Гомелю і Бабруйску. На вэлёдроме будуць праведзены гульні па гарадкох. На вэлёдроме-ж будуць наладжаны вэлёгонкі па 1, 3 і 5 кілёмэтраў.

Пачынае працаваць вэлёсэкцыя.

Заўтра на вэлёдроме саду „Профінтэрн" пачне працаваць міжсаюзная вэлёсэкцыя. Запіс у сябры сэкцыі працягваецца.

Падрыхтоўка да Усебеларускай спартакіады.

Ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да Усебеларускай спартакіады сялянскіх фізкультурнікаў: рамантуецца пляцоўка ў садзе „Прафінтэрн", будуецца новая бэтонная спортпляцоўка, устанаўліваецца палявы тэлефон, радыё. ВСФК Бел. загатовіў 5000 білетаў для ўваходу на спартакіаду, якія будуць разьмеркаваны па прадпрыемствах і ўстановах.

Прыезд гасьцей на Спартакіаду.

На Усебеларускую Спартакіаду сялянскіх фізкультурнікаў чакаецца прыезд прадстаўнікоў спартінтэрну, Украінскага савету фізкультуры, ЦСФК РСФСР, прадстаўнікоў Беларускай вайсковай акругі і др.

Зьезд спэцыялістаў чыгункі.

20 верасьня ў Менску адчыніцца Ўсебеларускі зьезд інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў саюзу чыгуначнікаў. Паміж іншымі пытаньнямі зьезд абгаворыць даклад аб 5-гадовым пляне разьвіцьця транспарту, эканомпраца і ўдзел у ёй інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў. У працы зьезду прыме ўдзел да 30 чалавек, працягнецца ён 3-4 дні.

Аплата рабочых, паступаючых у ВНУ.

Нашаму супрацоўніку паведамілі ў Наркампрацы, што рабочыя і служачыя, якія камандыруюцца ў рабфакі і паступаюць у ВНУ, навінны ад сваіх прапрыемстваў атрымаць выкадную дапамогу ў разьмеры месячнага заработку.

Рабочыя і служачыя, якія паступалі ў рабфакі і ВНУ, але ня былі прыняты, маюць права вярнуцца на ранейшае месца працы. Не пазьней, як праз 5 дзён пасьля абвяшчэньня вынікаў прыёму, прадпрыемствы і ўстановы павінны прыняць абратна на працу такіх рабочых і служачых.

Падача заяў у ВНУ.

Паводле апошніх вестак Наркамасьветы ў БДУ пададзена 957 заяў, з іх 195—ад рабочых. У Сельска-Гаспадарчую Акадэмію—481 заява, з якіх 86 ад рабочых і ў Вэтэрынарны інстытут пададзена дагэтуль 159 заяў у тым ліку 34 ад рабочых.

Рабочых у савецкі апарат.

Згодна рашэньню агульнага сходу рабочых менскага заводу „Дрэваапрацоўшчык"—3 рабочых вылучаны ў апарат НКФ Беларусі замест вычашчаных: Клімавецкі—рабочы з 2) гадовым стажам. Кузьнец. Добравольскі—рабочы стаж 21 год. Далецкі,—столяр, актыўны грамадзкі працаўнік.

Усе рабочыя зараз займаюцца на ўсебеларускіх курсах вылучэнцаў.

Рэспубліканскі фонд дапамогі бяспрытульным.

У пачатку бягучага году дзеля павялічэньня наплыву сродкаў у рэспубліканскі фонд дапамогі бяспрытульным, рэдакцыя газэты „Известия ЦИК СССР и ВЦИК" супольна з Дзіцячай камісіяй пры ЎвецВК выпусьціла спэцыяльныя падпісныя лісты, якія былі разасланы па СССР ва ўсе ўстановы, прадпрыемствы, заводы, школы і г. д.

Да гэтага часу большасьць падпісных лістоў з сабранымі сумамі звыш 200.000 руб., ужо зварочаны назад. Усё-ж большая колькасьць лістоў, на гледзячы на індывідуальныя напаміны, яшчэ не зварочаны.

Улічваючы, што кожнаму гэткаму лісту вядзецца спэцыяльны вучот і згуба яго разгледжваецца, як згуба грашовага дакуманту, рэдакцыя газэты „Известия ЦИК СССР и ВЦИК" і дзіцячая камісія, просяць усе арганізацыі, установы, прадпрыемствы і школы, якім былі разасланы падпісныя лісты, тэрмінова скончыць падпіску па ім і звараціць гэткія па адрасу (Москва, 37, Страстная пл., проезд им. Сверцова-Степанова, 5, главная контора газеты „Известия ЦИК СССР и ВЦИК").

Нядзельны Унівэрсытэт „Бязбожніка" пры БДУ.

ЦС „Бязбожніка" складзена камісія дзеля распрацоўкі пытаньня аб адчыненьні пры БДУ нядзельнага Унівэрсытэту „Бязбожніка". У Камісію ўвайшлі т. т. Платун, праф. Нікольскі і проф. Вольфсон.

Абсьледваньне нацыянальнай працы.

Прэзыдыум ЦП саюзу хэмікаў парашыў правесьці абсьледваньне пастаноўкі нацыянальнай працы на больш буйных прадпрыемствах. Для абсьледваньня на ф-ках: „Чырвоная Бярэзіна", „Домбаль", „Ноўка" камандыраван прадстаўнік саюзу.

Прафсаюзы—ў дапамогу вёсцы.

Аргаддзелам ЦСПСБ зараз падагулена праца па ўдзелу прафсаюзаў у васенняй пасеўнай кампаніі.

Рабочыя брыгады арганізавалі 25 калектыўных гаспадарак, 2 машынных таварыствы, 2 малочныя гаспадаркі 1 мэліарацыйную.

Рабочымі для вёсак закуплена 189 новых плугоў, адрамантавана—3516. У вёскі накіравана 2 трактары, 9 новых веялак, 6 малацілак.

Курсы дзесятнікаў-лесарубаў.

Згодна рашэньню Прэзыдыума ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых з 15 жніўня ў Бабруйску арганізоўваюцца 3-хмесячныя курсы для падрыхтоўкі з ліку батракоў дзесятнікаў лесарубаў.

На курсы будуць прыняты 60 чалавек.

Куткі кас ашчаднасьці.

У мэтах папулярызацыі ашчаднай справы, пры клюбах і некаторых чырвоных куткох адчыняюцца куткі кас ашчаднасьці. У кутках будзе літаратура па розных галінах ашчаднай справы, будуць выдавацца розныя даведкі і г. д.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 14-га ЖНІЎНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.86	—
Бяспроц. выйгр паз. 26 г.	128.75	130.75
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.10	101.50
10 проц. выйгр. пазыка 1927 г.	26.28	26.38
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.01	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.64	10.69
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.95	26.05
2 „ „ „ проц.	26.65	26.75
„ „ „ 6-проц.	25.54	25.64
II проц. дзярж. паз. 28 г.	104.98	105,05
12 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	102.45	—

ПАПРАЎКА.

У газэце „Савецкая Беларусь" за 13 жніўня ў фэльетоне „Супакойнай ночы"... ўкралася недакладнасьць: надрукавана—„больш сьпіш—лепш грашыш", а трэба: „больш сьпіш—менш грашыш"...

Будуецца новы завод.

У мэтах забясьпечаньня Крычаўскага фасфарытнага заводу фасфарытнаю рудою, кіраўніцтва Белстромтрэсту гэтымі днямі закончыла частку работ па рэгуляцыі ракі Сожа. Поўная рэгуляцыя будзе зроблена НК Шляхаў Зносін СССР у наступным годзе.

Белстромтрэстам ужо закуплена 16 віцін (барж), агульны тапнаж якіх складае да 100000 пуд. 12 віцін ужо знаходзяцца на месцы руднікаў у Бахраўцы (РСФСР), дзе нагружаюцца фасфарытнаю рудою, якая будзе сплаўлена ўніз па Сожу на Крычаўскі фасфарытны завод.

Трэба адзначыць, што адзіным шляхам дастаўкі руды да заводу зьяўляецца толькі водны шлях па рацэ Сожы. Чыгунка, якая будзе будавацца на лініі Магілеў—Амсьціслаўль—Рослаўль месцазнаходжаньня руды Бахраўка (РСФСР) з Крычаўскім фасфарытным заводам не зьвяжа. Таму рэгуляцыі ракі Сожы ў мэтах утварэньня яго судаходнаю рэкаю вынікаецца вельмі актуальным пытаньнем. Справа ў тым, што Сож у мясцох арабіўся вельмі плыкім, віціна з вялікім тапнажам прайсьці ня можа. Каб наладзіць тыя плыткія месцы і зрабіць шыя берагі, трэба затрачаць сродкі. Патрэбны і магутныя цельныя машыны і магутная людзкой энэргіі.

На месцы здабываньня руды раўцы ўжо здабыта каля 6000 пуд. сырцу, з якога пасьля прамыўкі дзе атрымана чыстая руда. Гэтае руды ўжо прамыта.

Пабудова Крычаўскага фасфарытнага заводу ідзе хуткім тэмпам. Пабудована 2 паверху. Будуецца тар'ялямі пабудова забясьпечанасьцю.

Гэтымі днямі будзе пачата пабудова Кліманіцкага фасфарытнага. Сырцу для млына ўжо звыш 100000 пудоў на месцы, мавіцкім раёне, Магілеўскае.

К моманту пуску заводу ўжо дзе дастаўлена.

Суд.

ЖУДАСНАЕ ЗАБОЙСТВА.

У в. Прысна, Веткаўскага раёну, Гомельскай акругі, жылі трое маладых хлапцоў: Мельнікаў Гаўрыла 19 г., Ленцоў Іван 19 г. і Пацеяў Міхась 17 год.

Нягледзячы на малады ўзрост, кожны з іх ужо ўсьпеў судзіцца: Мельнікаў за замах на забойства быў прыгавораны на тры гады зьняволеньня, Ленцаў за згвалтаваньне—на 1 год і 8 мес., Пацеяў за крадзеж—на тры месяцы прымусовых работ.

Вось гэтая, з маладых да раньняя „тройца" склала паміж сабою хаўрус, мэтаю якою было ўтварэньне у далейшым „прыбытковых" злачынств.

Недалёка ад в. Прысна, на хутары, жыла сям'я Маршыных. Сям'я была заможная, гаспадары старыя, а таму яны трымалі батракоў. У батракі да Маршыных паступіў брат Мельнікава Гаўрыла—Мельнікаў Іван.

Іван зышоўся з дачкой гаспадароў, зрабіўся іх зяцем і быў прыняты ў гаспадарку. Яны ўжо мелі двоіх дзяцей: аднаму два гады, другому 10 месяцаў.

Такім чынам сям'я Маршыных складалася: са старыка Маршына, яго жонкі, дачкі, зяця, двух унукаў, батрака-падростка паваляніна Сьцяпана і батрачкі Уліты Міхеявай.

Мельнікаў Гаўрыла ведаў ад брата Івана, што Мартыны жывуць добра, што ў іх ёсьць грошы, а таму „тройца" і парашыла пайсьці у госьці да Маршыных, дзе спадзявалася мець добры „прыбытак".

Сталі рыхтавацца: Мельнікаў і Ленцаў, здабыл